
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета
(Выходзіць з сакавіка 1990 г.)

№ 31 (243)

2 жніўня 1995 г.

Кошт — 500 рублёў

ПОСТУП ТЫДНЯ



❍ **27 ліпеня наша краіна адзначыла свой Дзень Незалежнасці**

❍ ***Па звестках Галоўнага ўпраўлення вышэйшай адукацыі Беларусі***, *на сярэдзіну ліпеня ў прыёмныя камісіі вышэйшых навучальных установ рэспублікі было пададзена 38 тысяч заяў прыблізна на 22 тысячы студэнцкіх месцаў. Самыя папулярныя спецыяльнасці ў абітурыентаў традыцыйныя — міжнародныя адносіны, правазнаўства, замежныя мовы, медыцына.*

❍ **На 670 студэнцкіх месцаў у Брэсцкім педуніверсітэце прэтэндуюць 1611 абітурыентаў**, што ў сярэднім складае 2,4 чалавекі на адно месца. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца спецыяльнасці, звязаныя з вывучэннем беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і культуры, на якія конкурс вышэйшы за сярэдні па ўстанове. Больш за 75% абітурыентаў вырашылі здаваць на экзаменах беларускую мову і літаратуру, а не мову суседняй дзяржавы, хоць яна ў нас на сённяшні дзень і лічыцца другой дзяржаўнай.

❍ ***У Менску ў памяшканні гасцёўні Уладзіслава Галубка, што ў Траецкім прадмесці, адбылося*** *адкрыццё унікальнай выставы, сярод экспанатаў якой — раяль Ларысы Александроўскай, цымбалы Іосіфа Жыновіча, народныя інструменты, выкананыя вядомымі беларускімі майстрамі.*

❍ **Рашэннем Нацыянальнага банка рэспублікі з 1 жніўня прыпыняецца** выпуск разліковых білетаў вартасцю ў 10 і 25 рублёў, і гэтыя купюры будуць выведзены з грашовага абароту. Цэны на вагавыя вырабы і паслугі будуць акруглены да 50 рублёў, а на штучныя тавары — дыферэнцыраваны.

❍ ***Кабінет Міністраў прыняў пастанову***, *згодна з якой будзе заключана пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным прызнанні і эквівалентнасці дакументаў аб адукацыі і вучоных званнях. Аналагічнае пагадненне будзе падпісана і з урадам Украіны.*


❍ **Група дэпутатаў Менскага гарсавета выступіла з ініцыятывай** аб правядзенні сёлетняй восенню агульнагарадскога рэферэндуму. Сярод прапануемых да абмеркавання жыхарамі сталіцы пытанняў — выбранне мэра горада і неабходнасць надання Менску афіцыйнага статуса сталіцы дзяржавы.

❍ ***Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны наладзіў*** *камптарную сувязь з вышэйшай школай у нямецкім горадзе Кілі. У студэнтаў і выкладчыкаў з'явіцца магчымасць пацікавіцца нават фондамі бібліятэкі кангрэса ЗША.*



ГУТАРКА З ПАЎЛАМ ЗНАЎЦОМ
Стар. 3.

БЕЛАРУСЬ У КАНАДСКІМ АТЛАСЕ
Стар. 4.



Малюнак Алега Карповіча.



З 11 па 17 ліпеня ў Магілёве праходзіў трэці Міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа». Падрабязнасці пра фестываль чытайце ў бліжэйшых нумарах «Нашага слова».
На здымку: Гімн «Магутны Божа» выконвае зводны хор. **Фота А.Ліціна.**

Адзначаны Дзень незалежнасці Беларусі

27 ліпеня да помніка Янку Купалу ў Менску прыйшлі людзі адзначыць сваё нацыянальнае свята. Пляц не ўмяшчаў усіх, хто сабраўся. Над натоўпам луналі бел-чырвона-белыя сцягі. Адбыўся мітынг. Выступалі Н. Гілевіч, Л. Баршчэўскі, П. Знавец, Я. Запруднік, З. Пазьняк ... Прамаўляў і прадстаўнік крымскіх татараў. Успомнілі і пра гераічны чачэнскі народ.

Мудрыя словы З. Пазьняка гучалі прароча. Для аптымізму пакуль няма падстаў, але адчувалася вера ў лепшае. Лідэр БНФ заклікаў да вялікай адраджэнскай работы.

Пасля мітынгу адбыўся канцэрт. Добра, што не было вялікай сутычкі з міліцыяй. Але гаварылі, што напалі на некалькіх чалавек, якія ішлі пад нацыянальным сцягам.

А ўвечары свята віталі салютам.

Генадзь КАЖАМЯКІН.

З рэдакцыйнай пошты

Шаноўны спадар рэдактар!

Дазвольце ад імя Міжнароднага камітэта беларусістаў выказаць Вам, а таксама аўтару матэрыялаў сп. Ірыне Крэнь шчырую падзяку за найбольш аб'ектыўнае і шырокае (калі ўзяць беларускія сродкі масавай інфармацыі) асвятленне работы II Міжнароднага кангрэса беларусістаў, яго складанай праблематыкі міжнацыянальнага, міжканфесійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння беларусаў з іншымі, найперш суседнімі народамі.

Адам МАЛЬДЗІС,
прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

дзе і што?

Якая сацыял-дэмакратыя адраджаецца?

25 ліпеня ў Менску адбылася сустрэча кіраўнікоў трох палітычных партый: Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, Партыі народнай згоды ды Партыі ўсебеларускага адзінства і згоды.

Вынікам спаткання стала падпісанне дамовы аб стварэнні Сацыял-дэмакратычнага саюза — структуры, якая будзе каардынаваць дзейнасць згаданых партый у сферах фармавання грамадскай думкі, вылучэння кандыдатаў у органы ўлады, супрацоўніцтве з прафсаюзнымі арганізацыямі і іншых.

«Адраджаючы праз сто год сацыял-дэмакратыю ў Беларусі, мы глядзім на яе як на спосаб самаарганізацыі людзей працы», — сказана ў заяве Каардынацыйнага камітэта СДС.

Тое, што апошнімі беларускімі сацыял-дэмакратамі ў гэтай заяве названыя сябры не Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, а Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (пазней — РКП(б) — ВКП(б) — КПСС), і тое, што нарада адбылася ў сталічным Доме-музеі I з'езда РСДРП, дае падставы для розных меркаванняў, але толькі час пакажа сапраўдныя палітычныя схільнасці ды нацыянальную скіраванасць новай палітычнай структуры.

У.П.

---

27 ліпеня ў Ракуцёўшчыне, дзе знаходзіцца філія музея Максіма Багдановіча, адбылося свята, якое зрабілася ўжо традыцыйным. Перад гледачамі выступілі фальклорныя калектывы Маладзечаншчыны, беларускія паэты, супрацоўнікі музея М. Багдановіча. Адбылося і адкрыццё новай экспазіцыі музея. Ракуцёўшчынскія святы прымеркаваны да Дня незалежнасці Беларусі.

Больш падрабязны рэпартаж пра гэту падзею чытайце ў наступным нумары «Нашага слова».

Л.Ц!

Але!

Мову навучання павінна выбіраць Беларускае Адраджэнне!

У нумары газеты «Звязда» за 18 ліпеня г.г. з'явілася актуальнае інтэрв'ю, якое ўзяла журналістка Алена Ляўковіч у галоўнага інспектара Галоўнага ўпраўлення агульнай і сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі і навукі Тамары Саўчук. Матэрыял меў красамоўную назву — «Мову навучання выбіраюць вучні. Дакладней — іх бацькі».

Дзякуй нашай каляжанцы за тое, што дапамагла нам дазнацца, чаго жадае згаданае міністэрства і як усё будзе цяпер, пасля рэферэндуму, з праблемай, якая прыкладна гучыць так: «Беларуска-расійская моўныя адносіны-суадносіны ў выкладанні прадметаў і дысцыплін у пачатковай ды сярэдняй школе суверэннай Рэспублікі Беларусь».

Вось, напрыклад, як Тамара Мікалаеўна адказвае на пытанне аб камплектаванні класаў у школах буйных гарадоў, дзе меншасць бацькоў выкажацца за беларускую мову навучання: **«Такая сітуацыя намі прадугледжана. У вялікіх гарадах, дзе школы знаходзяцца недалёка адна ад адной, адна школа можа быць рускамоўная, другая — беларускамоўная. Вельмі хочацца, каб мясцовыя органы ўлады іменна так і вырашылі гэта пытанне».**

Заўважылі, як няпэўна, як асцярожненька адказвае чыноўніца, чыя пасада ў сваёй назве мае два эпітэты «галоўны» (галоўны Інспектар Галоўнага ўпраўлення). Адна школа «можа быць» такая, другая — гэткая. А можа (зусім нават магчыма) і не быць? Хочацца, канешне, Тамары Мікалаеўне, каб «іменна так» зрабілі на месцы рэгіянальныя органы ўлады. Але ж яны тут, ого-го-го, свайго не ўпусцяць і «никакого белорусского языка в школы не допустят».

А чаму так адбудзецца? А таму, што бацькі пажадаюць, тое і зробяць. А зробяць яны так, як ім неафіцыйна «параяць настаўнікі і дырэктары школ, якім даўно «зверху» спушчана адпаведная дырэктыва.

«Дэмакратыя» бацькоўскага выбару ў гэтай справе наогул уражвае. Як і ўражваюць магчымасці згаданага міністэрства. Аказваецца, калі дзеці ў адным класе пажадаюць вучыцца хто на расійскай, хто на беларускай, хто на польскай мовах (па логіцы — на ўкраінскай, на яўрэйскай, на татарскай, на летувіскай і г.д.), то ў гэткіх класах выкладанне прадметаў рэкамендуецца весці на беларускай мове, але абавязкова будзе вывучацца расійская, а па жаданні, польская, украінская ці яўрэйская. Цікава, адкуль у адну школу прыйдуць польскія, украінскія ці яўрэйскія педагогі-мовазнаўцы? Можа выпішам такіх з Украіны, Польшчы або Ізраіля за валюту?

Смешны рэферэндум. Смешная міністэрская калгатня. Было б, мусіць, яшчэ й не так смешна, каб не гэтак балела на сэрцы праз падобны смех. Дзе ж ты ва ўсім гэтым тлуме, сама Беларуская Дзяржава? Ці табе ўжо і Адраджэнне беларускага народа не патрэбна? А мо ты задумала ўласнае самагубства?

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА.

Наш каментар

Мы жывём, як на вулкане, што вось-вось выкіне палаючую магму

У масавых газетах друкуюцца вынікі сацыялагічнага апытання ў чэрвені 1995 г. **1414 чалавек** па агульнанацыянальнай рэпрэзентатыўнай выбарцы. Яго правёў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) пры садзейнічанні Міжнароднага цэнтра прыватнага прадпрымальніцтва (СІРЕ ЗША).

Уражвае, што пры значным пагаршэнні жыцця нашых суграмадзян (64,8 % з апытаных), чые спадзяванні на паляпшэнне дабрабыту на сёлетні год не спраўдзіліся, у людскія душы запоўз страх за ўласнае жыццё ды жыцці родных-блізкіх.

Зразумела, **53,4 працэнта** даволі абгрунтавана назвалі сярод таго, што палохае, — экалагічную катастрофу. Нам хапіла, каб усё зразумець, аднаго Чарнобыля. Але ж далей па ходу апытання ідзе Марс — бог вайны. Такім чынам, **грамадзянскай вайны на Беларусі баяцца 47 працэнтаў, вайны з іншымі краінамі — 23,7, міжнацыянальных канфліктаў — 20,1 працэнта нашых землякоў.**

Пра што ж сведчаць апошнія тры лічбы? А больш дакладна — першая і трэцяя?

Ды пра тое, што ў грамадстве намеціўся жорстка палітызаваны раскол. На прыкмеце сацыяльнай — на адным полюсе тыя, хто вельмі хутка ўзбагачаецца, на другім — хто вельмі хутка пераўтвараецца ў жабракоў, пры адсутнасці так званага «буфернага», сярэдняга, класа. Ну, а боязь міжнацыянальных канфліктаў — гэта ўжо спарадкаванне непісьменнай і бяздумнай нацыянальнай палітыкі, вынікам якой стаў знакаміты на ўсю Еўропу рэферэндум, які нас вядзе ў каланіяльную залежнасць. Здаём эканоміку на рабаванне Расіі. Здаём роднае слова на вынішчэнне расійскай мовай. Здаём беларускую спрадвечную сімволіку на замену ее «стара-новай» бэсэсэраўскай. Здаём толькі што адноўленую гісторыю Беларускай Дзяржавы на карысць русафільства і саюзафільства.

Вось і задумаліся людзі: ці не замнога здаём? Ці не знойдуцца тыя, хто пачне актыўна супрацьстаяць неакаланізатарскаму замаху на духоўнасць карэннай нацыі? А раптам згарбузуюць свае сілы і пачнуць падымацца з каленяў такім чынам, як гэта паспрабавалі ў свой час зрабіць Тадэвуш Касцюшка ды Кастусь Каліноўскі.

Што ж, гэта добра, калі грамадства задумваецца аб уласным лёсе і робіць выбар паміж дабром і злом, праўдай і фальшу, свабодай і рабствам, рэформамі і вайной. Зразумела, — робіць пазітыўны выбар.



Блаславі, Божа!



Зянон Пазьняк і Галіна Вашчанка пажаніліся. Шлюб яны бралі ў Магілёве, у касцёле святога Станіслава.

Калектыў рэдакцыі нашай газеты зычыць дарагім Галіне і Зянону шчаслівага сямейнага жыцця ды просіць Бога благаславіць сужонцаў.

У газетах

Ахвяры Смаргонскага гета не забытыя

«...На сцяне Ашчадбанка ў Смаргоні з'явілася мемарыяльная дошка з шасцікутнай зоркай і надпісам на двух мовах: яўрэйскай і беларускай. Яна — сімвал памяці яўрэям, якія загінулі ў гады вайны 1941-1945 гадоў у Смаргонскім гета... Дарэчы, напярэдадні юбілею Перамогі і вызвалення Рэспублікі Беларусь раённая газета «Светлы шлях»стала гістарычным дакументам. На яе старонках былі змешчаны прозвішчы яўрэяў, якія загінулі ў гета...»

Паломніцтва ў Будслаў

«... З усёй Беларусі прыйшлі ў першыя дні ліпеня вернікі-каталікі да цудадзейнага абраза Маці Божай Будслаўскай. Упершыню пабывалі там і астравецкія дзеці ўзростам ад 12 да 16 гадоў — парафіяне мясцовага касцёла Святой Троіцы. Маршрут «Астравец—Жодзішкі—Іжа—Касцяневічы—Будслаў» працягам у 133 км юныя паломнікі прайшлі пешшу...»

Што пілі ў Аўцюках з івянецкіх кубкаў?

«... Незвычайныя прызы-кубкі з лаканічнай назвай «Напіся не абліся» вырабілі на Івянецкім заводзе мастацкай керамікі, што ў Валожынскім раёне. Зроблены яны па заказу: сваю прадукцыю івянецкія ганчары адправілі ў Аўцюкі на Гомельшчыну. Тут, як вядома, з 7 па 9 ліпеня праходзіў першы ўсебеларускі фестываль народнага гумару. Славутым майстрам з Валожыншчыны прапанавалі паказаць выраблёную прадукцыю ў своеасаблівым «горадзе майстроў» на выстаўцы-продажы таго, чаго ў краме не знойдзеш. А дванаццаць кубкаў-смяшынак «Напіся не абліся» ўручаны гасцям і пераможцам розных конкурсаў аўцюкоўскага фестывалю.

(«Рэгіянальная газета», №12, 1995).

«Сапраўдная незалежнасць нас не абміне...»

«...Людзям неабходна растлумачыць, што свой лёс трэба браць ў свае рукі. На жаль, мы ўсё яшчэ не маем сапраўднай незалежнасці. У нас яна, так бы мовіць, толькі прызнаная. Зараз мы ідзём па шляху вернападданства Расіі. Але я ўпэўнены, што ўсё ж сапраўдная незалежнасць нас не абміне. Таму што большасць моладзі настроена патрыятычна».

(З інтэрв'ю Станіслава Шушкевіча газеце «Свабодныя прафсаюзы», № 30(69), 1995).

Нігілізм і нацыяналізм

«...Нацыянальны нігілізм, хай будзе гэта ў выглядзе «саўковага» інтэрнацыяналізму або ў «славянска-саборнай» форме непрызнання беларусаў і ўкраінцаў самастойнымі, асобнымі ад рускай, нацыямі, па вялікаму рахунку, ёсць тое ж самае, што і нацыяналізм.»

(Газета «Грамадзянін», спецвыпуск, 1995).

Слава Грунвальда будзе жыць у сэрцах беларусаў!

«Гэта прыгожая маляўнічая дзея быццам бы перанесла ўсіх гледачоў на 585 гадоў назад, у той драматычны і слаўны дзень, калі нашыя мужныя продкі ў крывавай бітве разбілі жалезнае войска агрэсіўных тэўтонаў. Велічна ішлі славянскія воі ў кальчугах і шлемах, скрыжоўваліся мячы ў паядынках, луналі ў небе баявыя сцягі Вялікага Княства Літоўскага...

Так прайшло днямі дзякуючы намаганням энтузіястаў у Менску, на беразе Свіслачы ля Палаца дзяцей і моладзі, свята ў гонар чарговых угодкаў Грунвальдскай бітвы. Тыя, хто прыйшоў на яго, змаглі пачуць песні вандроўных бардаў, убачыць высакародных дам ва ўбранні сярэдневечча і нават самога караля. Шмат намаганняў для арганізацыі гэтага свята, да якога ніяк не дапасуецца казённае слова «мерапрыемства», прыклалі сябры аргкамітэта, які складаўся са шчырых прыхільнікаў беларушчыны, прадстаўнікі рыцарскага клуба «Сэрца дракона», артысты тэатра імя Янкі Купалы і іншых творчых калектываў.

Шкада толькі, што з вялікай насцярожанасцю паставіліся да гэтай ініцыятывы нашы афіцыйныя ўлады. Аргкамітэт планаваў значна шырэйшую праграму, але не атрымаў адпаведнага дазволу. Проста дзівішся, як палохаюць нашае чыноўніцтва любыя праявы здаровага нацыянальнага духу, гістарычнай самасвядомасці народа. Нешта падобнае назіралася падчас святкавання ўгодкаў Аршанскай бітвы. Дапусцім, можна яшчэ неяк зразумець, што тая падзея выклікае двайстыя эмоцыі ў нашых «інтэрнацыяналістаў»: усё ж славяне змагаліся супраць славян... Але ж Грунвальд, як і Вялікая Айчынная вайна, — яскравы прыклад яднання славянскіх народаў у імя перамогі над агульным ворагам. Міжволі прыходзіш да высновы, што гістарычная адукацыя большасці нашага чыноўніцтва абмяжоўваецца пастулатамі «Кароткага курса».

...Можна, вядома, адмяніць гістарычную сімволіку, забараніць святкаванне славутай падзеі. Але саму гэту падзею ўжо не закрэсліш...»

(«Сталіца», № 29(35), 1995).

Залаты медаль

«...У Ляхавічах жыве дзевяцікласнік школы-гімназіі Дзмітрый Кругляй, які займаецца ў народнай студыі выяўленчага мастацтва «Апалон»... Менавіта ён — адзіны беларус, які заваяваў залаты медаль у сусветным конкурсе, што праводзіць Японская акадэмія мастацтваў сумесна з ЮНЕСКА раз у сем гадоў. На гэты раз у конкурсе прынялі ўдзел мастакі з 200 краінаў свету, аднак Дзмітрый быў першым. А называецца ягоная работа «Чалавек і Сусвет», якая надзвычай вобразна і глыбінна передае арыгінальнасць светапогляду юнага мастака».


(«Дзеці і мы», № 14(98), 1995).

Патрабуецца Закон

«Чаму ж так вольна на Берасцейшчыне, ды і па ўсёй рэспубліцы пачуваюцца госці з Каўказа, іншых рэгіёнаў? А таму, што няма ў Беларусі Закона кантролю за замежнымі грамадзянамі!»

(«Брестский курьер», № 29(229), 1995).

 АКТУАЛЬНА



Яму 28 гадоў. Яго «малая радзіма» — вёска Вялікае Малешава на Століншчыне. Пачатак жыцця — не дужа салодкі. У 12 гадоў застаўся круглаю сіратою, таму ладны кавалак свайго маленства давялося правесці ў сценах школы-інтэрната. Сярэднюю адукацыю Павел набываў у Менску — у адным з ПТВ па спецыяльнасці электраманцёр. З 1985 па 1987 гады служыў у войску. У 1988-м — электрамантажнік у вытворчым аб'яднанні «Менскбудматэрыялы». Адначасова робіць рашучыя захады, каб ажыццявіць сваё самае запаветнае жаданне — стаць юрыстам. Увесь вольны час сядзіць над падручнікамі, рыхтуецца паступаць на юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. І паступае. А ў 1993 годзе атрымлівае дыплом выдатніка.

І вось хутка будзе два гады, як Павел Кірылавіч Знавец працуе на родным юрфаку і на аддзяленні міжнародных зносін БДУ — выкладае міжнароднае права. Плюс да сказанага — актывіст Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, ад якой і быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнай Рады па Давыд-Гарадоцкай акрузе №37.

Ва ўлётках, што распаўсюджвала група падтрымкі **Паўла Знаўца**, я для сябе падкрэсліў чырвоным алоўкам некалькі вытрымак:

« Мінуў час, калі дэпутатам парламента мог быць непрафесіянал. Зараз дэпутату трэба будзе пастаянна працаваць у камітэтах і камісіях, распрацоўваць добрыя законы, спрыяць развіццю міжнародных сувязяў Беларусі і г.д. Сітуацыя на Беларусі пагаршаецца — патрэбны рэформы. Як ніколі, зараз у Вярхоўны Савет трэба выбраць разумных, свядомых, сумленных, маладых прафесіяналаў — юрыстаў, палітолагаў, эканамістаў, бо гэта вышэйшы заканадаўчы орган...»

«Веру ў розум і разважлівасць беларуса, бо без веры жыць нельга. Беларусь павінна заняць сваё пачэснае месца сярод народаў Еўропы, а гэта значыць павінна заставацца самастойнай, незалежнай краінай, якая забяспечыць дабрабыт народу...»

«Калі акажаце давер, сорамна за мяне вам не будзе. Катэджы мне не патрэбны, хвалюе толькі, што будзе з Беларуссю, ці будзем мы, урэшце, жыць годна... Буду пастаянна прыслухоўвацца да парад маіх выбаршчыкаў і падтрымліваць з імі сувязь...»

Зразумела, шчырасць, родная мова, на якой былі напісаныя гэтыя ўлёткі, саграваLі душу. Але ж ці мала падобных (праўда, расійскамоўных) лісткоў атрымалі вяскоўцы той самай акругі ад больш сталых па ўзросту і па ўзроўню знаёмства з электаратам яшчэ сямі кандыдатаў, дзе былі старшыні калгасаў, учарашнія партработнікі і другія паважаныя асобы.

Павел Знавец: Будаваць незалежную і заможную Беларусь!

Чаму ў асноўным сельскі люд аддаў перавагу Паўлу Знаўцу, чым ён заваяваў іхнія сэрцы?

Уласна такім і было маё першае пытанне, калі мы сустрэліся з маладым парламентарыем Вярхоўнай Рады новага склікання.

— Мяркую, што, акрамя той праграмы сваёй дзейнасці ў будучым парламенце, акрамя той шчырасці, з якой я ўступаў у размову з людзьмі, мне дапамагла правільная тактыка вядзення сваіх выбарчых спраў і — працавітасць, — пачаў расказваць Павел Кірылавіч. — Мая група падтрымкі зрабіла ўсё магчымае, каб кандыдат сустрэўся з найбольшай колькасцю выбаршчыкаў. І мне гэта ўдалося. Мы абышлі ды аб'ехалі ўсе клубы, усе мехдвары і фермы, папярэджваючы загадзя аб сваіх «візітах». Ды й проста так завітвалі ў вёскі «на агеньчык». Не паспееш азірнуцца, як вакол цябе збіраюцца людзі. І пачынаюць з табой размову. Пытанні вострыя: ад прыхільнасці кандыдата да калгасаў да прыхільнасці да прыватнай ініцыятывы. Мой прынцып быў просты — не маніць, не абяцаць «залатых гор». Адзінае, што я цвёрда абяцаў выбаршчыкам, — як выберыце, то сувязь будзем трымаць моцную, пастараюся дапамагчы вырашыць справы і асабістыя, і, так бы мовіць, агульнага, калектыўнага інтарэсу сваіх землякоў. Трэба будзе — прыязджайце да мяне ў сталіцу. Трэба будзе — прыеду я да вас, каб ва ўсім разабрацца на месцы... Ну і апошні фактар — гэта мая маладосць, мая дасведчанасць у юрыспрудэнцыі. Памятаю, як адна цётка на нашай сустрэчы сказала: «А я гэтаму хлопцу веру, бо ён яшчэ не паспеў накрасці, яшчэ чысты перад Богам і людзьмі...» Зразумела, я красці і надалей не збіраюся, бо веру у Бога... У мяне маці пратэстанткай была, і я ад яе гэтую веру, быццам эстафету, пераняў...

— Павел Кірылавіч, Вы балатаваліся па «сваёй» акрузе — там нарадзіліся, непк агорвалі свае сіроцкае жыццё ў дзяцінстве. Канешне ж, ведалі асноўныя рысы вяскоўцаў Століншчыны, ведалі, як з імі трэба размаўляць і пра што...

— Так, ведаў. Мае землякі, зразумела, у асноўным — калгаснікі. Многія з іх — даволі паважанага ўзросту. І памяць у вяскоўцаў гістарычная не «кульгае». Людзі памятаюць часы, калі жылі «за палякамі», разумеюць, што такое прыватная ўласнасць на зямлю, што такое мець нейкі прыбытак ад, няхай дробнай, але сваёй, справы. А ў Давыд-Гарадоцкай зоне дык і наогул жывуць выдатныя народныя майстры-аграномы — насенняводы, кветкаводы, нават вінаградары сустракаюцца. Для іх уласная справа — гэта першая ўмова жыць заможна. Калі сканаў Сталін, калі троху палягчэла, мае землякі пачалі актыўна асвойваць рынкі збыту насення самых розных кветак у Беларусі, а затым і ў іншых рэспубліках СССР, нават да Сахаліна дабіраліся некаторыя. Таму яны вельмі нават не супраць, напрыклад, каб рэфармаваць калгасы, каб гаспадаркі заснуўваліся на долевым удзеле канкрэтнай уласнасці сялян на ўсе асноўныя фонды і асабліва — на зямлю. Тады, як яны мяркуюць, не пабяжыць у горад шукаць лепшай долі моладзь, тады яна ўдыхне ў сяло і сілу, і розум. А значыць, і заможнасць прыйдзе ў кожную хату... Так што я і мае сябры па групе падтрымкі ведалі, ад чаго адштурхоўвацца ў сваіх размовах з людзьмі...

— Наконт заходнебеларускіх палешукоў стараннямі некаторых палітыкаў рабілася шмат «нацыянальных» спекуляцый, якія зводзіліся да сцвярджэння: гэтыя палешукі — не беларусы, а яцвягі. Што Вы думаеце на гэты конт? Кім пачуваюцца Вашы землякі?

— У асноўным — беларусамі. Значна меншая частка — украінцамі. Але ўсе яны свой лёс, лёс уласных дзяцей ды ўнукаў звязваюць адназначна з лёсам Беларусі. Пры гэтым да беларушчыны ставяцца з вялікай прыязнасцю і павагай. Напрыклад, ва ўсіх школках і школах тут выкладанне прадметаў вядзецца чыста па-беларуску, створана беларускамоўнае асяроддзе вакол вучняў...

— Але гэта не пашкодзіла Вашым землякам даць станоўчы адказ на пытанні «аб мовах і сцягах» падчас правядзення сумнавядомага рэферэндуму...

— На мой погляд, толькі дваццаць працэнтаў «маёй» акругі наогул разумелі, што такое рэферэндум і ў чым заключаецца сэнс гэтай дзеі. Адзін мой знаёмы пенсіянер-калгаснік мне так сказаў: «Гэты рэферэнда да нас не прыязджаў, і я за яго галасаваць не буду...» Дзядзька думаў, гэта нейкі чалавек з Менску, які хоча у дэпутаты прарвацца... Калі ж да сказанага дадаць, што бязграматна сфармуляваныя пытанні заканчваліся прапановай прагаласаваць «за» або «супраць», што людзі, не разумеючы сэнсу справы, звярталіся па дапамогу да некага з членаў камісіі, а тыя, канешне, раілі выбаршчыкам зрабіць свой выбар так, як таго хацелася ініцыятарам усенароднага галасавання, то можна ўявіць усю амаральнасць гэтай акцыі. Чаму б замест «за» ці «супраць» не напісаць было ў бюлетэнях «падтрымліваю» або «не падтрымліваю»? Чаму б не намаляваць насупраць выявы «нова-старых» сцяга і герба — бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоню»? Таму адным з першых пытанняў, якія я і мае аднадумцы ўздымаем у Вярхоўнай Радзе 13-га склікання, будзе пытанне аб прызнанні вынікаў рэферэндуму несапраўднымі, бо ён прайшоў і ў парушэнне Закона аб рэферэндуме, і наогул у недэмакратычных умовах. А каб уся цывілізаваная супольнасць зразумела гэта, буду дамагацца стварэння камісіі з удзелам прадстаўнікоў Цэнтрвыбаркама і міжнароднай грамадскасці, што пісьмова апытала б дзве трэ акругі: ці разумелі людзі сутнасць рэферэндуму? ці здолелі прачытаць самастойна пытанні і самастойна прагаласаваць? ці разумелі, што грошы, якія пойдуць на пагашэнне тых выдаткаў, выкліканых наступствамі рэферэндуму, будуць узятыя з іхняй кішэні? ці ведалі, якая гэта будзе сума? А яна, між іншым, блізкая да трыльёна рублёў?

— Вы, мусіць, тлумачылі людзям, чаго ад іх дамагаюцца ініцыятары ўсенароднага галасавання?

— Тлумачыў. Але псіхалагічны ціск на вяскоўцаў і недэмакратычнасць умоў галасавання ўтварылі нонсэнс: землякі кааптавалі мяне, чалавека нацыянальна-дэмакратычных палітычных поглядаў, у беларускі парламент і адначасова праз рэферэндум выступілі супраць роднай мовы і гістарычнай сімволікі.

— Вось Вы гаворыце пра тое, што вельмі часта мясцовыя выбарчыя камісіі парушалі парадак падчас галасавання... Тым не менш, Вы прайшлі ў парламент.

— Ну што тут можна яшчэ сказаць? Мусіць, мая група падтрымкі правільна збудавала сваю тактыку кантролю сітуацыі на выбарчых участках. Напрыклад, за тыдзень да выбараў я наведаў усе школы акругі, ведаючы, што нярэдка камісіі складаюцца з настаўнікаў. І вельмі папрасіў, каб тыя да сваіх абавязкаў аднесліся сумленна, не ішлі на здзелкі з уласным сумленнем. І яно, сапраўды, так потым і было ўсё: настаўнікі не парушылі на сваіх участках духу і літару Закона аб выбарах. Але ж большасць участкаў была загадзя зарганізаваныя тымі, хто быў зацікаўлены, каб «заваліць» на выбарах «нацыяналістаў». Туды група падтрымкі, Давыд-Гарадоцкая філія Грамады накіравала дастатковую колькасць назіральнікаў, якія шматлікія спробы несумленнай гульні абсякалі на месцы. Памагалі нам і сябры БНФ, чый кандыдат таксама балатаваўся па гэтай акрузе. Узгадваць усе выпадкі парушэнняў тут не хачу. Цяпер трэба думаць больш пра тое, як і што рабіць у Вярхоўнай Радзе новага склікання, каб збудаваць вольную, незалежную Беларусь...

— Але ж выбарчая кампанія ў парламент не завершана. У лістападзе адбудуцца давыбары. Як Вы глядзіце на «заключны акт» збірання дэпутатаў у пакуль што «вакантныя» крэслы Авальнай залы?

— Аптымістычна. Нацыянал-патрыятычным і ліберальна-дэмакратычным сілам дастаткова часу, каб удакладніць свае праграмы, перабудаваць шэрагі, вылучыць на гэтыя «вакансіі» аўтарытэтных людзей. Я, напрыклад, на заходнебеларускім Палессі ведаю такіх вось патэнцыяльных кандыдатаў, якія могуць стаць дэпутатамі. Ім толькі трэба дапамагчы ў арганізацыі справы...

— Вы, як я разумею, заклапочаны стварэннем апазіцыі ў Вярхоўнай Радзе 13-га склікання?

— Я, як і Грамада, іншыя дэмакратычныя партыі і рухі, добра разумею, куды цягне Беларусь цяперашняе кіраўніцтва краіны. Таму апазіцыя дзеля захавання Беларусі як незалежнай дзяржавы будзе непазбежная. Ні пад якой зваблівай прыгожай намі нельга трапляць у каланіяльную залежнасць ні ад Усходу, ні ад Захаду. І тут я нават згодны выступаць разам з тымі аграрыямі ці камуністамі, якія за нашу дзяржаўнасць, за незалежнасць. Другая прыкмета, якая аб'ядная апазіцыю, — гэта скасаванне прэзідэнцкай пасады з унясеннем адпаведнай папраўкі у Канстытуцыю. Пакуль грамадства краіны хворае, пакуль яно, напрыклад, не да канца разбіраецца ў тым, што такое рэферэндум, пакуль наш народ не ўсвядоміў да канца ўласную гісторыю, а праз гісторыю не асэнсаваў сваёй задачы ў цывілізаванай супольнасці на будучыню, патрэбна парламенцкае кіраванне. Бо адзін чалавек сілаю неабмежаванай улады можа нас завесці ў такую багну, адкуль мы ніколі не выкараскаемся. І тут зноў жа ў апазіцыю могуць увайсці самыя шырокія колы любых сіл Вярхоўнай Рады — і «нацыяналы», і камуністы, і аграрыі, і народназгодаўцы. Хай кожны, каму дарагая наша Радзіма, бярэцца са свайго канца ратаваць яе ад духоўнага і фізічнага Чарнобыля.

Распытваў Алесь МІКАЛАЙЧАНКА.

У сусвеце

Канадскі атлас

P.R.Magocsi, Historical Atlas of Central Europe, Toronto, 1993

Універсітэтам у Таронта выдадзены «Гістарычны атлас Цэнтральнай і Усходняй Еўропы». Яго аўтар — прафесар Таронцкага універсітэта, кіраўнік Мультыкультуральнага гістарычнага таварыства Антарыо Поль Робэрт Мэгоцы — гісторык, выдатны знаўца гісторыі Усходняй Еўропы, у сваіх працах абараняе малыя еўрапейскія народы.

Атлас прадстаўляе чытачу падзеі згаданай у яго назве часткі кантынента ад V стагоддзя да 1992 года. Геаграфічная праца прафесара Мэгоцы ўключае тэрыторыю ад Урала да паўночна-ўсходняй Італіі, Аўстрыю і ўсходнюю частку Нямеччыны. Навуковая праца адлюстроўвае не толькі палітычныя і адміністрацыйныя змены, але і паказвае таксама мноства дробных падзеяў, эканамічную дыферэнцыяцыю рэгіёнаў, арганізацыйныя структуры цэркваў, сістэмы школьніцтва, узаемныя ўплывы культур, дэмаграфічныя змены ды працэсы міграцыі.

Жадаючы прааналізаваць характар і асаблівасці атласа, разгледзім некалькі мап, якія датычаць падзеяў на беларускіх землях і спраў усходняй царквы.

Мапа, што прадстаўляе размяшчэнне плямён ва Усходняй Еўропе, утрымлівае дадзеныя аб тэрыторыях, заселеных дрыгавічамі, крывічамі і радзімічамі — народнасцямі, якія далі пачатак беларускаму этнасу. На схеме, што датычыць IX стагоддзя, прадстаўлены абшар вялікамараўскай дзяржавы з Кракавам і Пшэмысьлем, на якім пачалося ўжыванне кірыліцы на тэрыторыі цяперашняй Польшчы.

Чарговая мапа прадстаўляе дзяржаўныя межы сярэдзіны XI стагоддзя. Упершыню ў такім прэстыжным выданні разглядаецца тэрытарыяльнае пашырэнне Полацкага, Тураўскага і Смаленскага княстваў. Да таго ж П.Р.Мэгоцы адносіць Палессе XIII стагоддзя да Турава-Пінскай зямлі. Здзіўляе толькі змяшчэнне на палітычнай мапе гэтага перыяду побач з назвамі ў мове арыгіналу назваў у мове літоўскай, напрыклад Пінск — Пінскас, Кіеў — Кіевс. У XIII-XIV стагоддзях сучасныя літоўскія назвы гэтых мясцовасцяў не ўжываліся, а Вялікае Княства Літоўскае не было выключна літоўскім у цяперашнім разуменні гэтага слова.

Шмат цікавай інфармацыі змяшчае мапа гандлёвых шляхоў сярэдзіны XV стагоддзя. З яе вынікае, што праз тэрыторыю сучаснай Беларусі праходзілі важныя шляхі на Усход і на Захад: з Масквы праз Смаленск, Віцебск і Полацк да Балтыкі ды з Масквы праз Смаленск, Барысаў, Менск (ці Вільню) да Гародні. Праўда, выклікае сумлеў значэнне шляхоў з поўдня на поўнач. Аўтар працы — адзіны з вядомых мне гісторыкаў, які падае шлях з Кіева да Смаленска ўздоўж Дняпра, абмінаючы лакальныя беларускія адгалінаванні галоўнай дарогі, што злучала Чорнае мора з Балтыйскім. З беларускіх земляў экспартаваліся не толькі мёд і воск, як пазначана на мапе. У XV-XVI стагоддзях з гэтай часткі ВКЛ вывозілі таксама збожжа, скуры, свойскую жывёлу.

Для даследчыкаў гісторыі хрысціянства ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе асабліва цікавымі будуць дзве мапы, што прадстаўляюць арганізацыйную структуру каталіцкай і праваслаўнай цэркваў у сярэдзіне XV і на пачатку XIX стагоддзя. На ёй пададзеныя гады паўстання сядзіб большасці дыяцэзіяў. У дачыненні да беларускіх земляў мапа, што прадстаўляе становішча ў XV стагоддзі, утрымлівае некалькі істотных памылак. Так, у той час не існавала праваслаўных дыяцэзіяў з сядзібамі ў Менску, Гародні і Вільні. Беларускія землі ўваходзілі ў склад кіеўскай мітрапалітарнай дыяцэзіі, архіепіскапства полацкага, а таксама епіскапатаў смаленскага, турава-пінскага ды ўладзімірска-берасцейскага. Падобныя недакладнасці сустракаюцца ў дачыненні і да іншых тэрыторый.

Больш дакладнай з'яўляецца мапа размяшчэння рэфармацкіх цэркваў у Цэнтральнай Еўропе XVI стагоддзя ды мапы раздзелу дыяцэзіяў каталіцкай, уніяцкай і праваслаўнай цэркваў у 1900 годзе. Гэтыя схемы, маючыя розныя ступені дакладнасці, — вынік даследавання гісторыі царквы ва Усходняй Еўропе. П.Р.Мэгоцы, працуючы над згаданымі тэмамі, быў змушаны абапірацца на ўжо існуючыя працы, якія далёкія ад дакладнага тлумачэння стану рэчаў.

Аб школьніцтве і культуры Цэнтральна-Усходняй Еўропы інфармуе мапа геаграфічнага размяшчэння універсітэтаў і друкарняў, выкананая метадам прасторава-храналагічным. Нават павярхоўны яе аналіз выяўляе значную дыспрапорцыю ў развіцці асветніцтва на тэрыторыі Чэхіі ды Польшчы ў параўнанні з балканскімі краінамі ці Украінай.

Вельмі цікавымі з'яўляюцца схемы змен дзяржаўных межаў у XIX і XX стагоддзях. У гэтай частцы атласа аўтар робіць спробу тлумачэння мноства праблем, напрыклад, размяшчэння нямецкага, яўрэйскага ды армянскага насельніцтва ў міжваенным часе. З даследаванняў П.Р.Мэгоцы вынікае, што найбольшы працэнт яўрэйскага насельніцтва быў у беларускіх гарадах (у Слоніме — 78 працэнтаў, у Бярэсці — 65,8, у Бабруйску — 60, у Гомелі — 56,4). Дыскусіі можа выклікаць разгляд мапы міграцыі пасля Другой сусветнай вайны. Пададзеныя ёй лічбы выклікаюць розныя ацэнкі гісторыкаў. Тым не менш добра, што ў атласе гэтая праблема разглядаецца...

Мноства гістарычных праблем атлас падае ў картаграфічнай форме, напрыклад, палітычныя змены пасля I і II сусветных войнаў. Памер закранутых у гэтай працы праблем і іх значэнне дазваляюць высока ацаніць працу амерыканскага гісторыка, нягледзячы на заўважаныя памылкі. Трэба таксама дадаць, што ўсе мапы маюць вопісы разгляданых на іх праблем і падзей. Ужыванне гэткай формы падання звестак асабліва каштоўнае, бо атлас адрасаваны чытачам, незнаёмым з гісторыяй Усходняй Еўропы. Карыстанне атласам робяць лягчэйшымі індэксы імёнаў і геаграфічных назваў ды бібліяграфія крыніц, якімі карыстаўся аўтар.

Згаданы атлас можна лічыць удалай спробай агульнага прадстаўлення ў форме мапаў гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Добра таксама, што яго аўтар — асоба не еўрапейскага паходжання, не ўцягнуты ў спрэчкі мясцовых гісторыкаў. Погляд з адлегласці на нашу гісторыю дадае даверу працы П.Р.Мэгоцы. Для беларусаў жа гэты Гістарычны атлас Цэнтральнай і Усходняй Еўропы мае асаблівае значэнне, бо ўпершыню англамоўныя чытачы атрымалі магчымасць знаёмства з гісторыяй нашага народа і яго дзяржавы. Беларусь, нават у час, калі яна знаходзілася ў межах іншых дзяржаў, не была аб'ектам выключна геаграфічным. Своеасаблівым падсумаваннем яе гісторыі, накрэсленай амерыканскім гісторыкам, стала з'яўленне на мапе Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў 1992 годзе яе як незалежнай дзяржавы. Гэты факт пацвярджае: складаныя падзеі, што адбываліся ў гэтым рэгіёне свету, не знішчылі малыя народы. Паўстанне незалежных Македоніі, Эстоніі ці Беларусі — сведчанне гэтага.

Антон МІРАНОВІЧ.
(Беласток).
(Перадрук з альманаха «Białoruskie Zeszyty Historyczne», №2, 1995.)

Якому ж народу служыў Міндоўг?

У вячэрнім выпуску навін у пачатку ліпеня сёлета на Беларускім тэлебачанні дыктарам (мне здаецца, гэта быў Алег Круглякоў) была зачытана інфармацыя аб падзеі, важнай у гісторыі беларускага народа, якую, аднак, святкаваў толькі жамойцкі (летувіскі) народ. У ёй, у прыватнасці, было сказана, што ў гэты дзень (6 ліпеня) Літва святкавала Дзень незалежнасці, калі першы і апошні кароль Вялікага Княства Літоўскага Міндаўгас у 1253 годзе прыняў карону ад Папы Рымскага і каталіцкую веру. Далей гаварылася, што гэтае свята праводзілася ва ўсіх гарадах Літвы. Былі ўзняты сцягі трох прыбалтыйскіх дзяржаў...

Спачатку падумалася, як магла інфармацыя такога роду пранікнуць на БТ? Многія ж, асабліва адукаваныя і культурныя ліцвіны(беларусы), ведаюць, што Вялікае Княства ў аснове сваёй (і з самага пачатку свайго ўтварэння) было найперш беларускай дзяржавай. Такая інфармацыя вельмі ж балюча б'е па нацыянальным гонары і годнасці нашага народа, прыніжае яго ў вачах Еўропы і свету. Дзіўна і прыкра чуць такое паведамленне (праўда, нічым істотным яно не адрознівалася ад папярэдняга, мінулагодняга) у беларускіх сродках масавай інфармацыі ўжо некалькі год запар без належнай ацэнкі гэтай падзеі з нашага боку. Акрамя таго, яна (інфармацыя) уводзіць у зман гледачоў БТ. Мяне нямала здзівіла і адначасова абурыла, як маглі людзі, адказныя за выпуск навін, прапусціць у тэлеэфір гэтыя, некалькі надзвычай шкодныя для нашай гістарычнай свядомасці радкі?!

На гэта можа быць толькі два адказы. Або гэтыя людзі не ведаюць ці слаба ведаюць праўдзівую гісторыю свайго народа. Або ўжо іншыя асобы, якія моцна ўплываюць на работу БТ, не зацікаўленыя, каб праўдзівая інфармацыя пра нашае гістарычнае мінулае трапіла да тэлегледача. Таму многія гістарычныя падзеі падаюцца на тэлебачанні ў не вельмі выгадным для нас асвятленні, скажона, фальсіфікавана. Або падобнай гістарычнай інфармацыі не даецца належнага, як у апошнім выпадку, каментара, што таксама прыносіць шкоду. Такім чынам, тэкст, зачытаны дыктарам 6 ліпеня гэтага года, павінен быў мець належны каментар, ацэнку, якія б не супярэчылі праўдзіваму погляду на ВКЛ як на славянскую (беларускую ў аснове сваёй) дзяржаву. Пранікненне ў тэлеэфір інфармацыі пра каранацыю Міндоўга сведчыць пра тое, што на БТ нават адукаваныя і культурныя людзі не ведаюць або слаба ведаюць гісторыю Беларусі, а што тут гаварыць пра простых людзей?! Таму нам трэба пастаянна прапагандаваць беларускую гісторыю і культуру на старонках перыёдыкі. Па-першае, таму што навукова-папулярных выданняў па беларускай мінуўшчыне ў нас яшчэ мала. Па-другое, калі часам некаторыя перыядычныя выданні і змяшчаюць публікацыі па гісторыі Беларусі, то і яны нярэдка (асабліва гэта датычыць рэакцыйных, антыбеларускіх газет і часопісаў) скажаюць гістарычныя падзеі, факты і пазбаўлены гістарычнай праўды. Праўдзівую ж гісторыю Беларусі можна ўсё-такі пазнаць, толькі б было жаданне. Напрыклад, па першапачатковай гісторыі Новагародка (Наваградка) і Вялікага Княства маецца шэраг прац. Асабліва ў гэтым плане шмат зрабіў беларускі вучоны М.І.Ермаловіч. Можна прывесці назвы некалькіх яго кніг: «Па слядах аднаго міфа» (Мн.,1989;1991), «Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды» (Мн.,1990).

Давайце ж пройдзем па старонках выданняў гэтага вучонага. У дарэвалюцыйнай расійскай і савецкай гісторыяграфіі Міндоўг звычайна падаецца як балцкі князь, які выражаў інтарэсы літоўскіх феадалаў. Аднак падобны погляд на Міндоўга знаходзіцца ў супярэчнасці з гістарычнымі фактамі.

Недавер да Міндоўга як да балцкага князя спачатку ўзнікае ўжо таму, што ён аказаўся на чале Новагародка, на чале славянскай дзяржавы — спачатку Новагародскага княства, а пасля Вялікага Княства Літоўскага. Калі б ВКЛ на самай справе было балцкім гаспадарствам, то і яго сталіца (Новагародак) была б балцкім местам. Яскравым прыкладам з'яўляецца Рыга, якая была на працягу стагоддзяў нямецкім горадам, хаця ў Лівоніі пераважала карэннае (латышскае) насельніцтва. Падобнае можна сказаць і пра Канстанцінопаль, які праз некаторы час пасля захопу яго туркамі ператварыўся ў тыповы турэцкі горад і нават стаў называцца Стамбулам. Новагародак (Наваградак) жа заўсёды быў і застаўся славянскім (беларускім) местам.

Зразумець, чаму Міндоўг (дарэчы, у дакументах XIII ст. сустракаецца не толькі гэта форма імя, але і іншыя, напр., Мінда, Мендог, што можа ўжо сведчыць аб славянскім паходжанні князя, бо такія імёны былі вядомы славянам) аказаўся на чале праваслаўнага Новагародка, дапамагае вельмі важнае для нас адкрыццё М.Ермаловіча, што старажытная летапісная Літва знаходзілася не на тэрыторыі сучаснай Жамойці(так званай Аўкштайціі),а на абшарах Заходняй Беларусі, у Верхнім Панямонні: прыблізна паміж Маладзечнам і Слонімам з поўначы на поўдзень і Менскам і Наваградкам з усходу на захад. Летапісная Літва, акружаная Полацкай, Тураўскай і Новагародскай землямі, з'яўлялася адной з гістарычных абласцей Беларусі. Такое геаграфічнае становішча Літвы і вызначыла яе далейшы лёс. Паколькі Новагародскае княства к сярэдзіне XIII стагоддзя дасягнула высокага эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця, то яно і ўзяло на сябе ініцыятыву аб'яднання беларускіх княстваў, а таксама балцкіх земляў. Аднак на шляху ажыццяўлення аб'яднаўчай палітыкі Новагародскай дзяржавы перш за ўсё стаяла Літва, таму заваёва яе і была першым крокам у здзяйсненні гэтай палітыкі.

Суседняй Літвой валадарыў Міндоўг. Ён, паводле М.Ермаловіча, у летапісах і хроніках успамінаецца выключна як наёмнік. Так, гэты князь у 1219 г. дае абавязацельствы галіцка-валынскім князям ваяваць супраць палякаў, а ў 1237 г. па жаданні Данілы Галіцкага змагаецца супраць Кандрата Мазавецкага, у 1245 г. дапамагае таму ж Данілу Галіцкаму ў яго барацьбе са сваім супернікам. Дзесьці на мяжы 1245-1246 гадоў Міндоўг дапамагае куронам ваяваць супраць крыжакоў. Аднак пры аблозе крэпасці Амботэн ён пацярпеў паразу і яму давялося адступаць. Услед за ім гналіся крыжакі, уварваліся ў яго ўладанні і зрабілі там вялікія спусташэнні. (І ўсе ж горада, у якім абараняўся Міндоўг, ім не ўдалося ўзяць.) Гэта аслабіла пазіцыі князя ў Літве, што і выкарысталі праціўнікі і пачалі супраць яго барацьбу. Па ўсім відаць, Міндоўг пацярпеў паразу і быў выгнаны з Літвы. Ён вымушаны быў «з многімі сваімі баярамі» ўцякаць у суседні Новагародак. І гэта, больш за ўсё верагодна, так і было, бо ў летапісе сказана, што пазней Міндоўг выгнаў сваіх праціўнікаў з Літвы «вражбою... за ворожство с ними». У Новагародку ён быў прыязна сустрэты, ахрышчаны ў праваслаўную веру («Миндовг прия веру Христову от Востока со многими бояры», адзначае Густынскі летапіс пад 1246 г.) і абраны князем. Прыняцце хрысціянскай веры прышлым князем з Літвы ў той ці іншай славянскай вобласці з'яўлялася неабходнай умовай абрання яго князем. Напрыклад, Даўмонт стаў пскоўскім князем пасля таго, як быў ахрышчаны (або перахрышчаны, як мяркуе М.Ермаловіч) у праваслаўе. Таўцівіл стаў полацкім князем таксама пасля свайго хрышчэння ў праваслаўную веру.

Міндоўг, пакрыўджаны сваімі суайчыннікамі, добра ведаў Літву і хутчэй чым хто-небудзь іншы мог яе падпарадкаваць, заваяваць, што і было ім зроблена ў канцы 1248 або ў пачатку 1249 г. Ён выганяе сваіх праціўнікаў: «за ворожство с ними Литву зане поимана бе вся земля Литовская». І гэтыя словы летапісу могуць сведчыць толькі аб адным: Міндоўг перад гэтым ніякай часткай Літвы не валодаў і ўсю яе мог заваяваць толькі з Новагародка.

Аднак умацаванне Новагародка і заваяванне ім Літвы не адпавядала планам галіцка-валынскіх князёў: яны самі намерыліся далучыць да свайго княства беларускія землі. Тры іх паходы вымусілі Новагародак адмовіцца ад Літвы. Каб выратаваць неяк сваё становішча, Міндоўг заключае саюз з Ордэнам і прымае ў 1253 годзе ад Папы Рымскага каралеўскую карону і пераходзіць у каталіцтва. (Каралеўскі тытул прымае ў 1254 г. і Даніла Галіцкі, каб стабілізаваць становішча на заходніх межах Галіцка-Валынскага княства.)

Усё гэта выклікала незадаволенасць праваслаўнага Новагародка, што і прывяло за сабой пазбаўленне Міндоўга новагародскага пасаду. Яму давялося задаволіцца толькі роляй князя Літвы.

Нягледзячы на шэраг няўдач, Новагародак не адмаўляецца ад планаў заваявання Літвы. Для гэтага яму па-ранейшаму патрэбен быў князь-ліцвін, які б мог з'явіцца ў Літве як законны гаспадар. Таму Новагародак абірае сваім князем Міндоўгавага сына — праваслаўнага фанатыка Войшалка. Ён у 1263-1264 гадах пры дапамозе новагародскага і пінскага войска канчаткова заваёўвае Літву, а таксама Налышчаны і Дзяволтву (паўднёва-ўсходняя частка сучаснай Жамойці (Летувы)).

У святле вышэйсказанага становіцца ясным, што Міндоўг з'яўляўся перш за ўсё новагародскім, беларускім князем, і гістарычныя падзеі, звязаныя з асобай гэтага чалавека (у прыватнасці, яго каранацыя ў 1253 г. у Новагародку), павінны найперш адзначацца нашым народам і нашай краінай, а не чужымі. На гэта ў іх няма гістарычных падстаў. Пры Міндоўгу ж былі закладзены першыя цагліны ў падмурак беларускай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага.

Вывучэнне праўдзівай гісторыі Беларусі ўзбройвае наш народ гістарычнымі ведамі, дзякуючы якім ён усведамляе сябе дзяржаўным народам з высокаразвітымі нацыянальнай свядомасцю, годнасцю і гонарам. А такі народ будзе ўвесь час імкнуцца да ўмацавання сваёй дзяржаўнасці — зарукі яго неўміручасці.

Анатоль ЛІТВІНОВІЧ.


Кола сям'і

Здароўе

Гаючыя рукі

Сёння яго прафесія самая распаўсюджаная ў свеце — лекар з гаючымі рукамі.

Міхаіл Жаркоў скончыў у сямідзесятыя гады Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры. Спецыялізаваўся ў напрамку розных сістэм аздараўлення, рэабілітацыі і масажу. Нейкі час выкладаў методыку масажу на курсах пры прафсаюзах Беларусі. Адказнасць перад слухачамі і пацыентамі ўвесь час пабуджала яго ўдасканальваць прыёмы і метады аздараўлення. Пастаянная вучоба стала нормай жыцця, аб чым сведчаць шматлікія дыпломы з курсаў удасканалення, апошні з якіх, міжнародны, засведчыў, што ён касметолаг вышэйшай кваліфікацыі. За 15 гадоў практычнай дзейнасці Міхаіл Яфімавіч стварыў уласную, арыгінальную і дынамічную сістэму аздараўлення. Яго пацыентамі сталі не толькі жыхары Беларусі, але і грамадзяне замежных краін.



— Міхаіл Яфімавіч, напачатку гутаркі растлумачце, калі ласка, што сабою ўяўляе Ваш аздараўленчы сеанс?

— Мой сеанс камбінаваны і працягваецца гадзіну. Я спалучаю класічныя і ўсходнія віды масажу з фізіятэрапеўтычным лячэннем, у працэсе якога выкарыстоўваю апаратуру, дазволеную Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Эфектыўнасць лячэння дасягаецца ўздзеяннем розных прыёмаў масажу і фізіятэрапеўтычных фактараў на адпаведныя зоны і кропкі цела. У выніку — магутная актывізацыя рэзерваў арганізма, яго здольнасці да самаабнаўлення і амаладжэння. Працуючы з пацыентамі, я заўважыў, што адначасова з паляпшэннем стану здароўя ў маіх падапечных паляпшаецца стан скуры цела і твару — яна становіцца гладкай і эластычнай. А гэта азначае, што адпаведны масаж паляпшае капілярны кровазварот усяго арганізма.

— Што капіляры — гэта дробныя, разгалінаваныя па ўсім целе сасудзікі — людзі ведаюць, але якая іх роля ў кровазвароце арганізма ведае не кожны.

— Капіляры — сувязное звяно паміж крывёй і пазаклетачнай вадкасцю. Яны жывяць клетку і садзейнічаюць утылізацыі (перапрацоўцы) яе адходаў, забяспечваючы тым самым абмен рэчываў. Агульная даўжыня капіляраў у здаровага чалавека складае прыблізна сто тысяч кіламетраў. Яны здольны развівацца, разрастацца, а таксама занікаць і гінуць. Сістэма капіляраў у парадку — клеткі нармальна жывяцца, ачышчаюцца і інтэнсіўна дзеляцца, абумоўліваючы маладосць, устойлівасць і здароўе арганізма. Парушана сістэма работы капіляраў — працэс разбурэння клетак дамінуе над працэсам іх ўзнаўлення. Арганізм старэе, становіцца нямоглым, узнікаюць сасудзістыя і іншыя захворванні. Таму ўзнаўленне і паляпшэнне капілярнай сістэмы — першапачатковая задача маіх сеансаў. Нават лакальнае ажыўленне перыферычнай капілярнай сеткі аўтаматычна паляпшае кровазварот ва ўсім арганізме.

— А што адбываецца далей?

— А далей усё ідзе як па ланцужку: паляпшаецца гнуткасць суставаў, актывізуе работу галаўны і спінны мозг, у выніку чаго адраджаецца інтэлект, памяць, амаладжваюцца пазваночнік і ўнутраныя органы. У працэсе сеанса я звяртаю асаблівую ўвагу на пазваночнік і канечнасці. Бо застой крыві ў пальцах рук і ног можа выклікаць амярцвенне, хваробу Рэйно і іншыя немачы.

— А як рэагуе на гэтыя захады сама крывяносная сістэма?

— Як рэагуе? Умацоўваюцца сценкі сасудаў, вымываюцца вянозныя бляшкі, ачышчаецца вянознае рэчышча, у выніку чаго хаваюцца выпнутыя вены, нармалізуецца артэрыяльны ціск, прападаюць галаўныя болі і г.д. Абноўлены арганізм уваходзіць у рэжым устойлівай самарэгуляцыі. Адзначу, што натуральным прыцягам маіх прафесійных інтарэсаў стаў касметычны напрамак. Паступова паглыбляю свае веды ў галіне касметалогіі і павялічваю час работы над тварам. Прыёмы класічнага і ўсходняга масажу ў спалучэнні з першакласнай лячэбнай касметыкай на аснове папярэдняга аздараўленчага масажу прыводзіць да такіх незвычайных змен у становішчы скуры твару, што з упэўненасцю магу сказаць: патрэба ў касметычных аперацыях на доўгі час адпадае. Як бачна, мае аздараўленчыя сеансы паступова перараслі ў аздараўленча-касметычныя. Іх працягласць — дзве гадзіны. Хачу падкрэсліць, што такія сеансы надзвычай дабратворна ўплываюць на нервовую сістэму, робяць яе больш устойлівай да стрэсаў.

— Як часта пажадана праходзіць падобныя медыка-аздараўленчыя сеансы?

— Курс складаецца з дзесяці — пятнаццаці сеансаў на працягу месяца-паўтара (не кожны дзень), што дазваляе значна аднавіць капілярную сістэму арганізма і дапамагчы пацыенту вызваліцца ад многіх захворванняў, а таксама даць магчымасць засвоіць яму пэўны аб'ём ведаў і практыкаванняў, якім я абавязкова навучаю. Для таго каб падтрымліваць тонус арганізма на дасягнутым узроўні, рэкамендуецца праходзіць сістэматычныя адзіночныя сеансы (раз у месяц).

— Вы любіце сваю работу?

— Люблю. Яна пастаянна стымулюе вучобу і пошук, патрабуе ад мяне любячага сэрца і спачування; рук, якія бачаць і адчуваюць; розуму, які накіроўвае і сэрца, і рукі на дапамогу тым, хто яе патрабуе. Я шчаслівы, калі мае пацыенты здабываюць фізічнае і духоўнае здароўе і... прыгажосць.

— А ці можна нашым чытачам да Вас звяртацца ў выпадку патрэбы?

— Калі ласка. Мой тэлефон 57-40-03.

— Дзякуй за гутарку.

Распытвала Ірына КРЭНЬ.

У нашай хаце свята

«Веснавыя ключыкі»

Як правесці дзень нараджэння

(Заканчэнне.)

Вядучая. Так! Але Зіма спалохалася, што хутка мы яе адолеем, і пачала нас замыкаць у сваіх падземных пячорах у палон. Зараз мы будзем спрабаваць вызваліцца. Хто не баіцца варожага палону?

Выбіраецца з дзяцей добраахвотнік. На падлогу кладзецца капялюш брыльмі ўніз.

Вядучая. Зараз я звяжу шалікам рукі Магутнага Зубра за спіной і ў такім становішчы ён павінен надзець гэты капялюш сабе на галаву. Надзене — вызваліцца...

Дзеці па чарзе са звязанымі за спіной рукамі спрабуюць надзець капялюш.

Вядучая. Ну, вось, мы ўсе і вызваліліся і знайшлі на парозе нашай турмы яшчэ адзін ключ! Колькі іх цяпер у нас?

Дзеці. Пяць!

Вядучая. Колькі засталося знайсці?

Дзеці. Два!

Вядучая. Зіма — вельмі неахайная і лянівая гаспадыня. У яе падземным палацы звалены ў кучу самыя розныя рэчы. У адной з такіх куча ў Зіма і схавала шосты ключык. Мы павінны ўсе гэтыя рэчы перабраць. Бачыце гэты паднос, накрыты хусткай? Кожны з вас будзе падыходзіць сюды, я на нейкі момант буду здымаць хустку, пасля зноў накрыю ёй паднос. А вы павінны будзеце назваць рэчы, якія ўбачылі на падносе.

(На паднос кладзецца ключ і некалькі дробных прадметаў. Дзеці па чарзе спрабуюць іх назваць пасля закрывання і адкрывання. Нарэшце некаму гэта ўдаецца. Але лепш у кожным заданні даць паўдзельнічаць усім дзецям.)

Вядучая. Цяпер колькі ключоў мы маем?

Дзеці. Шэсць!

Вядучая. Значыць, засталося знайсці апошні ключ. Зіма так перапалохалася, што напусціла на нас усе свае чары. Мы нават самі сябе пазнаць не можам! Але мусім гэта зрабіць.

Дзеці па чарзе падыходзяць да вядучай. Яна ставіць дзіця тварам да астатняй дружыны і прыкладае да яго падрыхтаваны аркуш з выразанай дзіркай для твару і малюнкам. Дзіця не павінна ведаць, што гэта за малюнак. Яно мае права толькі задаваць дружыне розныя пытанні пра «сваю» знеш-насць, дакладней, знешнасць таго казачнага героя, якога ўвасабляе, і з адказаў здагадацца, хто гэты герой. Напрыклад:

Алесь (Магутны Зубр). Што ў мяне на галаве?

Дружына. Бант!

Алесь. Я дзяўчынка?

Дружына. Так!

Алесь. А якога колеру мае валасы?

Дружына. Сінія!

Алесь. Я Мальвіна?

Дружына. Так!

(Калі малюнкі для гэтай гульні не падрыхтавалі, вядучая прапануе адгадаць, якім казачным героем зрабіўся нехта з дружыннікаў, па падказках.)

Вядучая. На Алесю вялікі капялюш... На Алесю доўгі плашч... Накідка з крыжам... У Алеся ёсць вусы і барада... У Алеся ёсць шпага... **(Адказ — мушкецёр або д'Артаньян.)**

Вядучая. Мы разбурылі ўсе чары злой чараўніцы Зімы. І зноў у нас Вясна (Лета), і мы можам адамкнуць наш торт. Скажам толькі яшчэ адну народную беларускую замову:

Ты, пчолка ярая,
Ты вылець з-за мора,
Ты вынесі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Адамкні лецечка,
Лета цёплае,
Замкні зіманьку,
Зіму сцюдзёную!

Імітуе адмыканне.

Вядучая. Вы цудоўна праявілі сябе сёння, як смелыя, дасціпныя, разумныя дзеці і сапраўдныя сябры Веранічкі. А Веранічка была добрым правадыром дружыны. Так?

Дзеці. Так!

Вядучая. Цяпер, каб Зіма больш да нас не сунулася, запалім на торціку святочныя свечкі. З днём нараджэння, Вераніка!

Смачна есці!

ЗАХАПЛЕННЕ — HOBBIES

Таемны і дзіўны раслінны свет! Мы, што паўсядзённа сутыкаемся з яго «асобамі», нат не спрабуем запытаць сябе, а ці па-людску мы ставімся да тых, каго нават не называем «братамі меншымі», да тых, хто ў нас пад нагамі, каго мы топчам... Як і нас...

Дык можа варта спыніцца, уважна пагледзець на зялёных, пакуль яшчэ, сяброў, паспрабаваць дазнаца хоць што-небудзь пра іх жыццё. Калісьці кельцкія жрацы — друіды мусілі па 20 гадоў жыць у лясах, назіраючы прыроду. У шмат каго з нас няма такога часу (ці такой патрэбы?), але ўсё ж ёсць аматары разгадак раслінных таямніцаў, доследаў з раслінамі.

ДОСЛЕДЫ З РАСЛІНАМІ. БЕЛЫ КОЛЕР

Ах, темен, темен мир,
И чувствуют лишь дети,
Какая тишина и радость
В белом цвете!

И.Бунин.

Даўно захапляюцца доследамі з раслінамі Надзея Батурыцкая і Тамара Фянчук, якая да таго ж заахвочвае займацца гэтай цікавай і патрэбнай працай брэсцкіх школьнікаў. Удваіх яны напісалі кніжку «Дзівосныя доследы з раслінамі». Прапануем некаторыя з іх нашым чытачам, спадзяёмся, што для каго-небудзь простыя доследы з раслінамі стануць пачаткам захаплення, а, магчыма, і вывучэння асаблівасцяў жывой прыроды. Адзін з сама простых дапаможа даведацца, чаму так часта бачым мы белыя кветкі, белы пух на сцяблінах і лісці, а таксама і белую бярозту. Калі зацікавіцца зонамі найбольшага распаўсюджання такіх раслінаў, то даведаемся, што больш за ўсё іх на высакагорных лугах і ў арктычнай зоне, дзе яны складаюць больш трэці ўсіх відаў. Крыху менш іх у сярэдняй паласе, а вось у стэпах і пустынях пераважаюць расліны з кветкамі іншых колераў.

Белы колер бяросты залежыць ад утрымання белага пігменту, які, паводле лацінскай назвы бярозіны — «бетуля», называецца бетулінам. Паспрабуйце самі «здабыць» крыху гэтага пігменту. Дзеля гэтага здробненую сухую бяросту пакладзіце ў колбу і павольна награвайце. Бетулін пачне выпарацца з кары і асядаць белым налётам на ўнутранай паверхні колбы.

А вось пялёсткі кветак ці пух іншых раслінаў падаюцца нам белымі з той жа прычыны, што і снег. Кожная асобная сняжынка не мае колеру, бо прапускае святло. Ды сняжынкі, падаючы адна на другую, адбіваюць святло, і снег здаецца белым. А вось лёд, што не мае паветраных поласцяў, цалкам празрысты, бо святло пранікае праз яго. У пялёстках, скажам, рамонка, вадзяной лілеі — шмат пустотаў-міжклетнікаў. І пераканацца, што гэта так, можна даволі простымі спосабамі. Варта сціснуць пялёстак пальцамі — паветра з міжклетнікаў выходзіць — і ён становіцца празрыстым, як лёд. Такім жа стане пялёстак, калі пакласці яго на некалькі гадзін у ваду. Паступова паветра ў міжклетніках будзе выціснута вадою.

Ды найбольш наглядны спосаб. Пялёсткі пакладзіце ў шпрыц і наліце поўны вады. Прыткніце пальцам адтуліну на тым канцы шпрыца, на які накладаецца іголка, і пацягніце поршань шпрыца. У шпрыцы ўтворыцца вакуум і паветра пачне выдзяляцца з пялёсткаў. Праз дзве хвіліны сцісніце поршнем ваду, яна хутка зойме пусткі міжклетнікаў і пялёсткі стануць празрыстымі.

З.С.

Мудрыя гавораць...

Мішэль Эйкем дэ Мантэнь, знакаміты французскі філосаф-мараліст, жыў у XVI ст. Яго філасофія зрабіла велізарны ўплыў на сучасную яму літаратуру Заходняй Еўропы і па-ранейшаму прыцягвае ўвагу. Між іншым, да сямі гадоў Мантэнь зусім не ведаў роднай французскай мовы, размаўляючы толькі на латыні. Прапануем чытачам некалькі вытрымак з «Вопытаў» Мішэля Эйкема дэ Мантэня.

Недастаткова гартаваць душу дзіцяці; гэтак жа неабходна загартоўваць і яго цела. Наша душа занадта перагружаная клопатамі, калі ў яе няма належнага памочніка; на яе тады прыпадае непасільная ноша, бо яна нясе яе за дваіх.

Адмоўцеся ад насілля і прымусу; няма нічога, на маю думку, каб гэтак псавала і перакрыўляла натуру з добрымі дадзенымі.

Трэба пазбягаць усяго дзіўнага і незвычайнага ў нашай маралі і паводзінах, бо гэта перашкаджае нам зносіцца з людзьмі і пакольні гэта ўвогуле — вычварэнства.

Жаданне адрозніцца ад ўсіх астатніх нязвыклым і незвычайным пакроем адзежы гаворыць пра дробязнасць душы; гэтак жа і ў мове.

Што да мяне, дык я перш за ўсё хацеў бы ведаць належным чынам сваю родную мову, а затым мову суседніх народаў, з якімі я найчасцей зношуся.

Шлюб — свяшчэнны і набожны саюз; вось чаму насалоды, якія ён прыносіць, павінны быць стрыманымі, сур'ёзнымі, нават, у нейкай ступені, строгімі... Але, кажучы шчыра, да чаго ж няшчасная жывёла — чалавек! Самой прыродай ён створаны так, што яму даступная толькі адна поўная і цэласная асалода — і аднак жа ён сам стараецца ўрэзаць яе сваімі недарэчнымі досціпамі.

Вучымся

Культура мовы

Пра Вадаліў і вадалей

У агульнавядомым даведніку — БелСЭ чытаем: *Вадаліў* (лац. Aquarius), адно з 12 сузор'яў задыяка. Тут для называння сузор'я ўжытая традыцыйная беларуская форма: менавіта складанае ўтварэнне на *-іў* з асновай назоўніка *вада* й дзеяслова *ліць* — вольны пераклад лацінскага тэрміна — фіксавалася з разгляданаю семантыкай лексікаграфічнымі працамі да 1962 года. Прыгадайма: лексема ʻвадаліўʼ (ʻліўʼ — нульсуфіксальны тып утварэння) была замацаваная ў значэнні «адно з сузор'яў» у навуковай тэрміналогіі 20-х гадоў (БНТ. В.3. Геаграфічныя і космаграфічныя тэрміны і назвы нябесных цел. Мн., 1923; М.Байкоў і С.Некрашэвіч. Беларуска-расійскі слоўнік. Мн., 1926). У аўтарытэтным расійска-беларускім слоўніку 1928 года пазначана: *Водолей — вадаліў* (заўважым адно, што тут аўтары, памянёныя Байкоў і Некрашэвіч, не засведчылі наяўнасці некалькіх значэнняў расійскай лексемы ʻводолейʼ). А ўжо ў «Руска-беларускім слоўніку» 1953 года слоўнікавыя артыкулы распісаныя дэталёва:

Водолей 1. (рабочий) вадаліў, -ліва м; 2. перен. пустаслоў, -лова м.

Водолей астр. Вадаліў, -ліва м.

Але традыцыйнае астранамічнае значэнне беларускага вадаліў ужо не фіксуецца, на дзіва, у «Беларуска-рускім слоўніку» 1962 года (Вадалей м.астр. Водолей). Вось жа, беларускаму «вадаліў», паводле ТСБМ (1977), уласцівыя 2 значэнні: 1)рабочы, які вылівае або адпампоўвае ваду, 2) стараста суднавых рабочых, старшы рабочы на баржы. Дарэчы дадаць, што менавіта гэтыя значэнні мае расійскае ʻводоливʼ. Навідавоку выраўноўванне значэнняў лексемаў ʻвыдаліўʼ і ʻводоливʼ. Большае семантычнае поле беларускага ʻвадаліўʼ у прыраўнанні з расійскім ‹водолив› змяншаецца аўтарамі перакладных і тлумачальнага акадэмічных слоўнікаў.

Але нялішне будзе прааналізаваць лексему ‹вадалей›, якая зафіксаваная, дарэчы, у ТСБМ з адзіным значэннем ‹пра таго, хто многа, але беззмястоўна піша, гаворыць›. Гэткага тыпу (з суфіксам -ей (-эй) аддзеяслоўныя назоўнікі бываюць асабовыя й неасабовыя (П.Сцяцко. Беларускае народнае словаўтварэнне. Афіксальныя назоўнікі. Мн., 1977). Асабовыя назоўнікі абазначаюць асобаў паводле іхняй схільнасці да адпаведнага дзеяння, часта з экспрэсіяй непахвальнасці (як і ʻвадалейʼ): *маней* ʻхлусʼ (Ф.Янкоўскі. Дыялектны слоўнік-1), целяпей ʻмаруда, мялаʼ (дыялектны слоўнік Зэльвеншчыны), махляваць, махалей ʻілгунʼ (дыялектны слоўнік Магілёўшчыны). Гэты тып словаўтварэння рэгіянальны (берасцейскія, гарадзенскія, магілёўскія гаворкі) і прадуктыўны. Уяўляецца, што ўжыванне слова «вадалей» дамэтнае ў літаратурнай мове ў разгледжаным значэнні як адзінкі з размоўным статусам, якая ўваходзіць у сінанімічны рад з лексемай «пустаслоў».

А што да назову сузор'я, дык тут, пэўне, служыцьме «вадаліў». Між іншым, навачаснае слоўнікавае абцінанне семантыкі гэтага слова апраўдана ігнаруецца ў выданнях «Беларускай Энцыклапедыі»: «Вадаліў» (сузор'е) ва ўжо адзначанай шматтомнай БелСЭ, у календарах апошніх гадоў. Таму заканамерныя спадзяванні на скорае папраўленне ў акадэмічных слоўніках, найдаступных сёння для карыстальнікаў мовы. Ці ж не прыспеў час пайсці тут за традыцыяй, улічыць клопат і рупнасць парадкавальнікаў беларушчыны, мянуючы задыякальнае сузор'е Вадалівам?

Юрась БУШЛЯКОЎ.

Папытай у кнігарні

Маленькі чалавек у вялікім свеце



Добрая дзіцячая кніжка — гэта заўсёды свята. А калі кніжка яшчэ беларуская, і нават напісаная ў духу Адраджэння — гэта падзея. Кніжка Алеся Бадака «Маленькі чалавек у вялікім свеце» — менавіта падзея. Як вызначыў аўтар у падзагалоўку, яго твор — «для бацькоў, дзядуль, бабуль і выхавацеляў дзіцячых садкоў». «Кніга, якую вы, шаноўныя чытачы, зараз трымаеце ў сваіх руках, гэта спроба дапамагчы бацькам, а таксама выхавацелям дзіцячых садкоў на аснове вершаў, апавяданняў павесці з дзецьмі шчырую размову пра агульначалавечыя каштоўнасці: любоў да Радзімы і павагу да старэйшых, пра дабрыню, ветлівасць і сяброўства, пра тое, чаму трэба берагчы прыроду, любіць усё жывое», — так піша Алесь Бадак у аўтарскай прадмове.

Сапраўды, шчырая інтанацыя характэрная для кнігі. З маленькімі суразмоўцамі аўтар гаворыць, як іх добры сябра: «Ты яшчэ маленькі, і пакуль вельмі мала чаго пабачыў у сваім жыцці. Ты яшчэ нават і не здагадваешся, якая вялікая і прыгожая твая Радзіма — Беларусь. Вялікая-вялікая, прыгожая-прыгожая! І столькі ў ёй ёсць цікавага, незвычайнага, нават казачнага!» — гэта словы першага раздзела кніжкі. Сапраўды, з прачытанага дзіця ўсвядоміць сябе прыналежным да роднай Беларусі, і, можа быць, з гэтага пачнецца выхаванне нацыянальнай свядомасці асобы, патрыёта сваёй Бацькаўшчыны.

У кожным раздзеле, а ўсяго іх адзінаццаць, акрамя аўтарскай прадмовы, багата вершаў, казак, загадак, апавяданняў. Усё гэта таксама належыць пяру аўтара кнігі. Таму, мабыць, кніга атрымалася цэласная, усе творы ў ёй — на адным, досыць высокім узроўні. Мастацкі тэкст перамяжаецца заданнямі для дзяцей, выкананне якіх мусіць дапамагчы засвоіць прачытанае.

Выданне рэкамендавана да друку навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Прадмову да яго напісаў паэт Віктар Шніп. Апошнія радкі гэтай прадмовы хочацца прывесці: «Алесь Бадак не складальнік зборніка для дашкалят, а аўтар кнігі. Кнігі, якая на сённяшні дзень самая патрэбная і карысная ў справе Адраджэння. Дай Бог і надалей аўтару «Маленькага чалавека ў вялікім свеце» пісаць цудоўныя творы для беларускіх дзетак».

Застаецца дадаць, што наклад кнігі ўсяго 3000 паасобнікаў, і парэкамендаваць чытачам «Нашага слова» пастарацца набыць яе для сваіх дзетак.

Л.Ш.

ACADEMIA «NS»

Гісторыя моваў на Беларусі

Уладзімір СВЯЖЫНСКІ,
кандыдат філалагічных навук

Беларуская мова

(Працяг.)

«Воженъ былъ пред царе и велм(о)жи для правды еу(а)глской, и вызналъ еи статечне: Быль насмеван для веры православной, лжен, безчещен, шарпан, от суду до суду, з турмы до турмы, през целыи два роки якъ злочинца який поволокан».

Мялецій СМАТРЫЦКІ. Казанне пахавальнае (на смерць Лявонція Карповіча).



Кірыліцкае кнігадрукаванне пасля Скарыны працягвалі яго бліжэйшыя паплечнікі і паслядоўнікі Сымон Будны (у Нясвіжы) і Васіль Цяпінскі (у маёнтку Цяпіна, цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл.). У другой палове XVI ст. у Заблудаве (каля Беластока) наладзілі друкарню Іван Фёдараў (Федаровіч) і Пётр Мсціславец, якія ўцяклі з Масквы. Вядомы палітычны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага Васіль Гарабурда ды купцы браты Кузьма і Лукаш Мамонічы адкрылі першую **брацкую** праваслаўную друкарню ў Вільні. Брацтвы заснавалі таксама друкарні ў Еўі (цяпер Вевіс у Літоўскай рэспубліцы) і ў Куцейне (каля Оршы). З брацтвамі супрацоўнічалі і перасоўныя друкарні (напрыклад, друкарня Спірыдона Собаля).

Пасля наступлення крызісу ў брацкім кнігадрукаванні ў Вялікім Княстве Літоўскім з 2-й паловы XVII ст. пачынае развівацца **уніяцкае** кнігадрукаванне. З Вільні ў Супрасль (пад Беласток) пераязджае друкарня, якая атрымлівае права **манапольнага выпуску уніяцкай літургічнай літаратуры**. **У XVIII** ст. Магілёўская брацкая, Гародзенская каралеўская, Супрасльская і Троіцкая Віленская друкарні пачынаюць друкаваць літаратуру для **расійскіх раскольнікаў-старавераў, якія, ратуючыся ад праследаванняў у сябе на радзіме, масава перасяляліся ў Вялікае Княства Літоўскае.**

Рэлігійная барацьба набыла вастрыню ў княстве пасля выхаду ў свет у 1577 годзе (г.зн. пасля прыбыцця ў ВКЛ езуітаў і пачатку іх змагання супраць Рэфармацыі) кнігі вядомага езуіта, заснавальніка Віленскай акадэміі (пазней — універсітэт) Пятра Скаргі «Аб адзінстве Божай царквы пад адзіным пастырам». (Кніга была выдадзена на польскай мове ў друкарні магната Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі, дзейнасць якога пагібельна адбілася на лёсе старабеларускай мовы.) У гэтай кнізе, адрасаванай вядомаму апекуну праваслаўнай царквы на Беларусі і Украіне князю Канстанціну Астрожскаму, акрамя ганьбы праваслаўю, меўся зварот да гэтага князя з просьбай падтрымаць правядзенне царкоўнай уніі і такім чынам умацаваць рэлігійныя і палітычныя пазіцыі Рыма ў Княстве. Сваім выданнем Скарга не столькі пасягнуў на аўтарытэт праваслаўнай царквы, колькі на права нацыянальнай самабытнасці праваслаўнага насельніцтва Княства. Кніга выклікала буру ў праваслаўным лагеры. Тыраж быў вельмі хутка скуплены багатымі праваслаўнымі і, як сцвярджае аўтар, знішчаны.

Пісьмовыя выступленні прыхільнікаў і праціўнікаў царкоўнай уніі і стварылі новую плынь літаратуры, якую назвалі **палемічнай**. Значную частку друкаванай канфесійнай літаратуры канца XVI-XVII стст. складалі таксама зборнікі пропаведзяў і павучэнняў.

Важнейшыя выданні таго часу — «Катэхізіс» (Вільня,1585), «Казанне Кірылы» Сцяпана Зізанія (Вільня,1596), «Казанне двое» Лявонція Карповіча (Еўе,1616), « Евангелле вучыцельнае» (Еўе, 1616), «Кінавіён» (Еўе,1618), «Казанне аб сямі тайнах царкоўных» (Вільня,1620), «Казанне пахавальнае» Мялецій Сматрыцкага (Вільня,1620), «Паўустаў» (Вільня,1622), «Бяседы Макарыя» (Вільня,1627), «Гісторыя аб Варлааме і Іясафе» (Куцейна,1637) і «Дзідаскалія» (Куцейна, 1653). Першаступеннае значэнне для гісторыі беларускай мовы маюць арыгінальныя кнігі «Казанне пахавальнае», «Казанне двое», «Навука аб сямі тайнах», «Дзідаскалія»: іх аўтары, будучы незалежнымі ад іншых тэкстаў, найбольш **поўна выявілі на пісьме тыя моўныя рысы, якія ім уяўляліся як сродкі літаратурнай мовы**. Каштоўнасць жа перакладаных твораў у тым, што ў іншых усходнеславянскіх друкарнях яны выдаваліся на царкоўнаславянскай мове, і супастаўленнем беларускіх і царкоўнаславянскіх тэкстаў можна выявіць важнейшыя спецыфічныя рысы тагачаснай літаратурнай мовы.

Сярод згаданых твораў асобнае месца займаюць «Казанне Кірылы» Сцяпана Зізанія і «Казанне пахавальнае» Мялеція Смарыцкага, у першым з якіх беларускі тэкст змешчаныпаралельна з польскім, другі ж адначасова быў выдадзены на польскай мове. Улічваючы пашырэнне ўжывання польскай мовы ў ВКЛ пасля Люблінскай уніі (і ўзмацненне ўздзеяння яе на беларускую), цікава вызначыць розніцу паміж згаданымі мовамі ў гэты час. Супаставім наступныя ўрыўкі «Казання Кірылы» Сцяпана Зізанія:

«Стережете абы васъ кто не здрадил. абовем много их прійдет во имя мое мовячи я естем х(ристо)с, и многих прелестят. а будете слышати о войнах и отповеди военные, смотрете а лякайтеся. пристоит бовем всему тому быти, але не тогды еще есть кончина, абовем повстанет народ на народ, и крулевство на крулевство, и будут голоды и мори и трясене по местом, а то все початок болестем» — «Strezezcie aby was kto nie zdradził, abowiem wiele ich przyj dzie w imię moie mowiąc: ia iestem Chrystus, y wiele ich zwiodą, i będziecie słyszeć o woynach, y opowiedzi woienne, patrzcie a nie lekaycie sye, musi bowiem wszytko to być, ale nie iuz będzie koniec, abowiem powstanie narod na narod, y krolestwo na krolestwo, y będą głody, y mory, y tresienie po miastom, a to wszystko poczatek bolesciam». Параўнанне паказвае, што некаторыя словы і формы польскага паходжання тагачасныя беларускія кніжнікі ўжо не лічылі чужымі.

Правапіс друкаваных рэлігійных кніг натуральна пераймае прыёмы, выпрацаваныя рукапісным пісьмом. У цэлым жа арфаграфія разглядаемых выданняў з'яўляецца прыкметным адступленнем ад тых зрухаў у бок жывога вымаўлення, што былі дасягнуты пісцамі рукапісаў. Асноўныя рысы гэтага вымаўлення (аканне-яканне, дзеканне-цеканне, падваенне зычных у становішчы паміж галоснымі, пераход *л* у *ў*, што ў рукапісах дасягала ўзроўню пэўнай нормы) у друкаваных кнігах адлюстраваны толькі адзінкавымі выпадковымі памылкамі друку. Толькі ў «Навуцы аб сямі тайнах царкоўных» і «Гісторыі аб Варлааме і Іясафе» прыкметная тэндэнцыя да фанетызацыі пісьма: тут даволі часта сустракаюцца напісанні з зацвярдзелымі зычнымі *(грешыти, прыняти, будучы, мовячы, чынечы).* Гук *г* у пазычаных словах у многіх кнігах перадаецца выпрацаваным у рукапісах спалучэннем *кг*, але ў «Паўуставе», «Бяседах Макарыя» і «Дзідаскаліі» для гэтай мэты ўжываецца новая літара **Г**: аллиГорічный, вилГотный, Гвалть, Гмахь (нагадаем спробы вярнуць яе ў беларускае пісьмо ў 20—30 гады XX ст.). У беларускім пісьме папярэдняга часу для перадачы гуку *ё* было спалучэнне *іо*, якое ў друкаваных кнігах выкарыстоўваецца больш шырока *(астроліокгь, маліованый, ліохь, сріодокь)*, вельмі шырока ўжываецца таксама літара *амега*. Цікавай асаблівасцю друкаваных выданняў з'яўляецца абазначэнне націску ў словах, дзякуючы чаму старадрукі з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння акцэнтуацыі старабеларускай мовы, якая значна адрозніваецца ад сучаснай. Прыкладам, словы *бéседа, дéкреть, зáгадка, зáконь* маюць націск на першым складзе. У марфалогіі друкаваных кніг побач з замацаваннем некаторых норм жывой мовы (формы назоўнікаў давальнага склону адзіночнага ліку тыпу *вечерови, голосови, довтіпови*, назоўнага склону множнага ліку тыпу *докторове злодееве, кролеве,* творнага склону адзіночнага ліку тыпу *поволностю, повестю, тяжкостю* і інш.) набылі значэнне нормы архаічныя формы дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку на *-тъ* (цвёрдае) тыпу *живетъ, знаетъ, мовитъ,* форм злітнага перфекту польскага паходжання тыпу *взялем, утратилем, взялесь, казалесь, мовилисмо, пришлисмо.* Друкаваныя кнігі вылучаюцца шырокім ужываннем абстрактнай лексікі, асабліва з суфіксам *-ость (срокгость, спросность, гойность).* Удзельная вага такіх слоў значна павялічваецца за кошт царкоўнаславянізмаў. **Аднак у параўнанні з маскоўскімі выданнямі ў беларускіх выразна бачная і народная моўная аснова**, што відаць з параўнання наступных урыўкаў.

Куцейнскае выданне:

«придалося двох мужей, в ошарпаном и шпетном оденью, на твари худых и барзо бледых поткати: Кролеви теды ведомо было, иж з оутруженя телеснаго и з працы живота богу посвечоного тело свое так высушили».

Маскоўскае выданне:

«и срете два мужа, раздранными и калными ризами облочена, худа же и бледа лицем суща: Сія же позна царь, изнурением телесе и постническими поты плоть истончену имевша.»

ACADEMIA «NS»

Ствараем энцыклапедыю «Новай зямлі»



Валянціна ВЫХОТА

Коласавы зернеткі

(Працяг.)

А хлопцы нават паўставалі,
Ў чыгунчык вочы паўстаўлялі,
Глядзяць, не моргнуць яны вокам:
Эх, мусіць смачны клёцкі з сокам!

Клёцка. Ням. Kloß m, Klos-chen n, с.-в.-ням.,ст.-в.-ням. kloß, зах.-герм.слова.

І толькі комінак гаротна
Над дахам высіўся маркотна.

Комін.Ням. Kamin, der (der Schornstein; die Esse) — паводле «Bildwörterbuch». Усе гэтыя словы — з адным асноўным значэннем 'комін' ('дымавая труба').

Ням. Kamin m ад грэч. káminos 'печ'; роднаснае грэч. kamára 'скляпенне' і лац. camarus 'дугападобны, скляпеністы'. Праз лац. camīnus пазычана ст.-в.-ням. kemīn, chemī, с.-в.-ням. kemī. Нов.-в.-ням. Kamin было зноў пазычана пад уплывам італ. camino. У заходняй і паўднёвай Нямеччыне, а таксама ў Швейцарыі і Цыролі — Kamin m як 'дымаход', што адпавядае бел. слову *комін*. *Kamin, der < грэч. → лац. → італ.> 1.комін; 2.камін.*

А пачакаўшы з паўгадзіны,
Нясуць жанкі, нясуць мужчыны
Кашы, каробкі, паўасміны
І ставяць ў рад на цвінтары
Усе велікодныя дары.

Каробка, кораб. Ням. Korb m, ст.-в.-ням. churp m, churba f (ад *korbia), с.-в.-ням. kröbe,Korb 'кораб'. І.-е, корань *ger- 'круціць, абвіваць'. Korb m рана пазычана з тым жа значэннем з лац. corbis f, m. Праз ням. пасрэдніцтва трапіла да балтаў і славян з тым жа значэннем.
Korb,der <лац.> кораб, каробка.

Антось у ход пусціў далоні
І коркі спр... ...а выбівае.

Корак. Ням. Kork m. Коркі з'явіліся ў нямецкіх аптэках у канцы XVII ст. Раней карысталіся воскам ці кудзеляю, а віно і піва налівалася прама з бочак. Слова прыйшло з іспанскай мовы chorcho. Гэта назва матэрыяла, з якога робяцца коркі: 'кара коркавага дуба'. Лац. quercus 'дуб'.
Kork, der <лац. → ісп. → нідэрл.> корак.

А перад тым, як спаць лажыцца,
Ён мусіў к хлопцам паддабрыцца.
......
Абы не легчы толькі з краю:
— Бо я з вас коўдру пасцягаю.

Коўдра. Ням. Kolter m 'падшыванае пакрывала', 'падшываная коўдра'. Пазычана з тым жа значэннем са ст.-франц. co(u)ltre у с.-в.-ням culter, gulter, kolter, golter пасля 1200 года. Французскае слова ўзыходзіць да лац. culcitra 'падушка, матрац'.
Kolter, der <лац. → франц.> коўдра.

Збіраем матэрыялы для «Крыўскай»(Беларускай) міфалагічнай энцыклапедыі

БАГАЧ. У жыцці земляроба ёсць самая шчаслівая пара — пара дастатку, калі і ў бедных ёсць хлеб на стале... Зразумела, чаму народ называе багачом свята, якое супадае з парой заканчэння жніва. Але ёсць факты, якія даюць падставу думаць, што **багач** — адно з земляробчых боствaў дахрысціянскага перыяду, адно з увасабленняў вядомага Нестараўскага летапісу Даждзьбога, — бога-Сонца, бога дастатку, багацця, на што паказвае і самое імя. Уяўленне пра гэтага бога сцерлася з памяці народа, але звесткі, што ён калісьці займаў ганаровае месца ў вераваннях беларусаў, захаваліся ў абрадах.

Галоўную ролю ў абрадзе гэтага свята выконвае «багач» або «багатце». Гэта — свевенька жыта з пастаўленай у яго свечкай. «Багач» стаіць на працягу года ў хаце чарговага гаспадара, на покуці пад абразамі. У гэты дзень свечку запальваюць, запрашаюць святара для малення, якое адбываецца перш у тым доме, дзе стаіць «багач». Пасля гаспадар услед за святаром нясе «багача» ў наступны двор, дзе іх сустракаюць гаспадары. Для сустрэчы ставяць у двары стол, засланы белым абрусам, на якім стаяць лубкі жыта, пшаніцы, ячменю. «Багач» ставіцца на стол, святар служыць кароткі малебен, а пасля ўсе запрашаюцца ў хату на пачастунак. «Багач» ставяць на покуці...

На другі канец сяла зганяюць усю скаціну, і калі абыдуць усе двары, то абносяць «багача» вакол статка. Пасля гэтага яго заносяць у хату, дзе ён прастаіць цэлы год. «Багач» паводле павер'я прыносіць у дом багацце і шчасце.

У некаторых мясцовасцях жыта і воск дзеля «багача» збіраецца з усёй вёскі і мяняецца толькі тады, калі «багач» пройдзе ўсе хаты або калі згарыць свечка. У іншых жа мясцовасцях жыта і свечка мяняюцца штогод чарговым гаспадаром, а жыта дзеля гэтага вымалочваюць з першага «зажынкавага» снапа. Замененае «багачовае» жыта ў такім выпадку змешваецца з прызначаным для сяўбы. Свечку ж рыхтуюць на агульнай вячэры і співаюць песні, якія нагадваюць дажынкавыя.

Ці не з'яўляецца гэтае злучэнне збажыны, сімвала дастатку, з свечкаю, сімвалам святаноснага пачатку? Ці не правобраз гэта Сонца — Даждзьбога, крыніцы святла і адначасова апекуна земляробства — бога прыбытку і дастатку? Сапраўды, цяжка прыдумаць больш адпаведную сімвалізацыю Сонца (паводле першабытнага ўяўлення пра яго), як пра бога — апекуна земляробства.

Апроч таго, тыя абставіны, што святкаванне «багача» больш-менш супадае з парою восеньскага раўнадзенства, таксама сведчыць на карысць прыналежнасці гэтага свята да сонечнага культа. І калі гэта так, то такім чынам замыкаецца цыкл святаў у гонар Сонца. Адно з гэтых свят безумоўна павінна было спраўляцца восенню: Каляды прысвечаны зімоваму Сонцу, Масленіца і Вялікдзень — вясноваму, Купала — летняму. І была б незразумелай адсутнасць свята ў гонар восеньскага Сонца, тым больш незразумела і невытлумачальна, бо менавіта ў гэтую пару першабытны чалавек бачыў плён яго ўздзеяння.

Трэба згадаць, што па-беларуску слова «багач» не выкарыстоўваецца ў тым сэнсе, як у расійскай мове — багаты чалавек. «Багач» выкарыстоўваецца для назвы свята, якое паводле царкоўнай традыцыі называецца Раство Багародзіцы.

Паводле Адама БАГДАНОВІЧА.

УРЭШЦЕ

ЧОРНАЯ СПІЖАРНЯ ПАСЯРОД ЕЎРАПЕЙСКАЙ БАГНЫ

(Лявон ВАШКО. Еўрапейскія гісторыі. Апавяданні. «Мастацкая літаратура», 1995)

Як кажуць славяне: злобнае дзіця — гэта ад продкаў...

Кніга Л.Вашко пачынаецца апавяданнем «Кызючка». Паважаны Лявон! Мне зрабілася дрэнна... Трагедыя! Навошта пачынаць кнігу так сумна? Але прабачце: ваш прыём — гэта аўтарскае.

Выбачайце яшчэ раз — я сапраўды памыліўся. Пасля прачытання другога апавядання пачынаеш разумець: Лявон Вашко — чорны гумарыст. Яго гумар — перапляценне галін сённяшняга жыцця, што маюць чорнае абгарэлае лісцё...

Вось ён — чорны гумар:

«Ніна, жонка Казіка Белабародзькі, кабета была нішто сабе, хаця не скажаш, што надта пекная. Невысокая, зграбная, адно нос у яе мо занадта даўгі быў, а на носе нейкая гуля сядзела...».

І далей:

«Казік Белабародзька кахаў Ніну. Яшчэ як кавалераваў з ёю, дык усё злаваў праз тое, што ягоная дзяўчына даспадобы іншым. «Мая яна, — думаў сам сабе Казік Белабародзька. — Нікому я яе не аддам. («Гаспадар») Чуеце? Хлопцам вельмі падабалася дзяўчына, у якой нос «мо занадта даўгі быў, а на носе нейкая гуля сядзела»...

А можа, гэта не чорны гумар? А нешта іншае. ГЕНІЯЛЬНАЕ! Па праўдзе кажучы, што пасля прачытання некаторых кніг расплюшчваюцца вочы на шмат якія рэчы. Я ўбачыў! Убачыў! ТАК! БЫВАЕ ГЕНІЯЛЬНАЯ ВЫРОДЛІВАСЦЬ !!!

Вось ён — чорны гумар (ці, можа, іншы накірунак мастацтва?):

«Яна вырашыла памяняць формы барацьбы. Перш-наперш яна адлупцавала да паўсмерці выпіваку Сапуна. Але яго біла нагамі, а той, спэцканы крывёю і брудам, валяўся пасярод ускрайняе вулкі і прасіўся:

— Не біце вы мяне, Антаніна Андрэеўна, дзяўчыначка мая любая! Не біце, калі ласка, курва вы старая!» («Дачка рэвалюцыянера»).

На працягу ўсёй кнігі мы бачым жыццё ў адным і тым жа гарадку, сустракаем адных і тых жа герояў, якія чамусьці калі з'язджаюць, то абавязкова ў Цюмень («Гаспадар», «Уцёкі», «Край на ўвесь свет», «Мярзотнік і бядак» і інш.). Відавочна, пра Цюмень у аўтара вельмі добрыя ўспаміны... Гэтыя паўтарэнні перагтвараюць апавяданні ў адно цэлае, вялікае, агромістае... З назвай «Еўрапейскія гісторыі».

На старонках апавяданняў вытанцоўвае ўсмешлівы чорны вушасты дзядзька-гумарок.

Але не давайце мне больш кніг Л.Вашко — я не разлічаны на геніяльнасць! Я не падрыхтаваны!

І на развітанне хачу зрабіць РЭКЛАМУ:

Зміцер ВІШНЁЎ.

Мікалай КРЫЎКО

СЛОЎНІК СІНОНІМАЎ

ПЕРАСА́ДЖВАЦЦА (устаючы з аднаго месца, садзіцца на другое або пераходзіць з аднаго транспарту на другі, каб ехаць далей) *— Ну, Андрэйка, перасаджвайся на маё месца, — кажа сыну тата і сам прыўстае з сядзення* (Юрэвіч). *На прыпынку Валодзя загаварыў да мяне: Міша, перасаджвайся на сваю парту*(Якімовіч). *Трэба было перасаджвацца на другі цягнік, каб дабірацца бліжэй да Слуцка* (Лынькоў). **ПЕРАСЯ́ДА́ЦЬ** *Дзеці заўсёды дазвалялі сабе недазволенае: шумелі і перагаворваліся, перасядалі з адной парты на другую* (Хведаровіч). *Адзін Клёцка толькі варочаўся, перасядаў: было віdаць, што сядзець яму нязручна* (Янкоўскі). *У час жніва многія з нас [механізатараў] перасядаюць на камбайны, каб дапамагчы калгасу хутчэй убраць ураджай* (Ракаед). — *Зак.:**Перасесці**.*

ПЕРАСЕ́СЦІ (у горле: затрымацца, не праходзіць далей у стрававод — пра ежу) *А калі ж яно заверне Лета ў полі і лугі? Як сцвярдзеюць трошкі зерні, Колас выгнуўшы тугі; Як зязюля адгукае,— Ў горле колас перасеў* (Бялевіч). *Слізкая, як мыла, бульба перасядала ў горле, а Дзіма еў, прагаю яе расолам і слухаў маці* (Капыловіч). **ЗАСЕ́СЦІ** *[Маці:] А жонка твая з языком, умее ўпікнуць так, што скарынка хлеба ў горле засядзе...*(Радкевіч). **СТАЦЬ** *Сыр стаў у горле, і Гарбача пачала мучыць ікаўка* (Мурашка). *Кашу памаслі — у горле не стане* (з народнага). **ЗАВЯ́ЗНУЦЬ** *Якава аж скаланула. Адкушаны кавалак хлеба завяз у роце* (Лобан). **ЗАХРА́СНУЦЬ** *[Алесь] перастае хрумстаць. Здаецца, што яблык захрас у горле: нялёгка яго пракаўтнуць* (Шамякін). *— Кашляе, мае галубкі, кашляе [карова], — падхватвае жаночы голас. — Нясчасная бульба хваціла і кашляе. Мусіць у горле захрасла...* (Чорны). // (пра словы, голас, спазмы і пад.) *Адразу ён [Гаранскі] неяк ажывіўся, нібы прысутнасць зяця скоўвала яго, быццам словы маглі перасесці ў горле і іх нельга будзе вымавіць* (Сабаленка). *Кроў шугае ў твар, даўкі камяк перасядае ў горле — і адразу цяжка, невыносна цяжка дыхаць* (Савіцкі). *Горыч сціснула грудзі, у горле засела камком. Наваколле на момант заслала ў вачах туманом...*(Куляшоў). *З дубам размаўляла [маці], Добры ён, сваяк, А ў мяне ад жалю ў горле стаў камяк* (Бядуля). *Ад напружанай думкі яго [Павалковіча] сухарлявы твар пачаў перасмыкацца. Ён зразумеў, што запяцца далей свой адказ нельга. Аднак словы адказу недзе завязлі ў горле* (Машара). *Клава праглынула горкі, салёны камяк, што завязнуў у горле і перашкаджаў гаварыць* (Васілёнак). *Не было голасу, абарваўся, захрас у горле* (Баранавых). *Тацяна, у якой цяжкае рыданне горкім камяком захрасла ў горле, выйшла таксама* (Шамякін). *Так горка стала на душы. Даўкі камяк крыўды захрас у горле* (Грогнеў). — *Незак.:* **Перасяда́ць, засяда́ць, станаві́цца, завяза́ць, вя́знуць, захра́саць.**



Цётка Тэкля.
Фотаздымак Анатоля Каляды.

Варшава 22.05.1995г.

POLSKIE RADIO S.A.

PROGRAM V



Al. Niepodległości 77/85
00-950 Warszawa
tel. 45 93 03
fax 44 41 23

Шаноўная Рэдакцыя Газэты "НАША СЛОВА" !


Журналісты Беларускай Рэдакцыі Польскага Радыё выказваюць словы глыбокай удзячнасьці за зьмяшчэньне інфармацыі пра час і хвалі нашых перадачаў у Вашай Газэце. Дзякуючы гэтаму многія жыхары Беларусі - Вашыя чытачы - даведаліся пра нашае існаваньне і, магчыма, сталіся нашымі слухачамі. А ў кожным выпадку, даведаліся, што могуць шукаць у эфіры беларускае слова з Варшавы.

Спадзяемся на далейшае супрацоўніцтва.

З пашанай
за Беларускую Рэдакцыю
Польскага Радыё -
Яраслаў Іванюк
- Яраслаў ІВАНЮК

Міжнародны камітэт беларусістаў разам з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Францішка Скарыны шукаюць рэферэнта на вакантную пасаду малодшага навуковага супрацоўніка, які добра ведае беларускую і англійскую мовы, валодае камп'ютарам (ці машынапісам). Сярод канкурэнтаў хочацца выбраць чалавека, шчыра зацікаўленага ў пашырэнні беларускай культуры ў свеце. тэл. 20-76-04.

Шаноўная рэдакцыя газеты «Наша слова»! Віншую ўсіх Вас з Днём Незалежнасці Беларусі! Моцнага здароўя Вам, поспехаў у Вашай добрай справе!
Мікалай Волкаў.
-27.07.95г.



220029
г. Менск,
Вул. Чычэрына, 1,
рэд. „Наша слова."
212029 Магілёў,
а/с 4, М. Волкаў

Творчасць нашых чытачоў

Святое

У глыб вякоў, у даўнюю даўніну
Пайшлі далёка нашы карані,
Мацуем працай мы сваю Айчыну
І славім тых, хто волю бараніў.

З душой адкрытай перад светам цэлым
Шукаем мы жыццёвы свой прасцяг,
Над намі рэе бел-чырвона-белы,
Як сімвал волі, старажытны сцяг.

Дай, Божа, шчасця мірнаму народу,
Ад цёмных сіл ратуй і ахавай!
Няхай жыве, квітнее год ад году
Радзіма наша — беларускі край!

Валянцін ДЗЯДЗЮК,
настаўнік.
в.Дамавіцк, Чэрвеньшчына.

Язык як перац

Лезе (у вочы), як муха ў спасаўку.
Лье, як з вядра (як з цэбра).
Льецца, як бяроза.
Лёгка (рабіць, працаваць), як гуртам.
Лёгка (жыць), як у гурце.
Лёгка бяжыць (скача), як сарна.
Лёгка, як з радзінаю (раднёй).
Лёгка, як пяро (пярынку) спаліць.
Лёгкі, як матыль (матылёк).
Лёгкі, як папера.
Лёгкі, як птушка.
Лёгкі, як пух (пушынка).
Лёгкі, як пярынка.
Люд як шкло.
Лізнуў, як жалеза на марозе.
Ліпіць, як арэх на сухой галіне.
Ліхі, як сабака шалёны.
Ліхі, як скула.

І смех і грэх

Пачутае «У Лявона»

Морж

— Шаноўныя заўсёднікі і госці шынка «У Лявона», — звяртаецца да прысутных адміністратар. — Хто з Вас зняў афішу вандроўнага звярынца, прашу вярнуць — за гэтую рэкламу нам плацяць грошы.

— Тую, дзе быў намаляваны морж? — удакладняе адна з наведвальніц.

— Так, так, тую.

— Яе забраў нейкі мужчына і сказаў, што шынок яшчэ паплаціцца за карыкатуру.

Вярблюд

— Ты наскубла вярблюджай поўсці на світэр? — здзіўлена перапытвае сяброўку модна апранутая паненка.

— А мне асабіста вярблюд не спадабаўся. Я да яго не падыходзіла. Ён такі аблезлы і ўсё зубы скаліць...

— А ты хацела, каб у вярблюда была такая ўсмешка, як у Лёлі з суседняга століка?

Насарог

У шынок заходзіць сталы наведвальнік. Ён абураны і злосна паўтарае:

— Не дарую, ніколі не дарую. Я падам на яго ў суд.

— Хто гэта цябе так даняў? — пытаюцца сябры.

— Сусед.

— Што ён табе зрабіў?

— Назваў летась насарогам.

— І ты толькі цяпер абураешся?

— Бо толькі сёння я быў у звярынцы.

Цар звяроў

— Ведаем, — прызнаецца сяброўцы дзяцюк пасля трэцяй чаркі, — я хачу быць, як леў...

— Як Леў Пятровіч з суседняга століка? Ён такі тоўсты...

— Не, як леў — цар звяроў...

— І ахвота табе ўсё жыццё сядзець у клетцы.

Заяц

— О, лаўцы! — вітаюць бывальцы трох сяброў, якія заходзяць у шынок з заплечнікамі і стрэльбай. — Як прайшло паляванне?

— Ат, зжаліўся Бог. Аднаго зайца падстрэлілі.

— А хто?

— Утрох.

— А як жа вы яго будзеце дзяліць?

— Ды мы яго й не знайшлі.

Камары

— Дык Вашыя бацькі паехалі ў госці і Вы засталіся адна ў кватэры?

— Каб жа адна — поўна камароў.

Вырваныя лісткі з Чырвонай кнігі пазбіраў З.С.

***

Чалавек прыехаў з Беларусі ў нямецкі горад і, заблудзіўшыся там, спытаў у першага сустрэчнага, як адшукаць дарогу да гатэля. Той згадзіўся правесці госця з-за мяжы і па дарозе спытаў:

— Адкуль Вы прыехалі?

— З Вайс Русланд! — Белая Русь.

— Белыя рускія? А чым яны розняцца ад проста рускіх?

Наш зямляк сумеўся: гэта ж трэба расказваць пра Вялікае Княства Літоўскае, пра войны з Масковіяй, пра еўрапейскую архітэктуру і магдэбургскае права беларускіх гарадоў, пра паўстанні — карацей, чытаць доўгую лекцыю. Таму ён вырашыў адказаць проста.

— Розніца відаць ужо з назвы. Мы — белыя.

Немец раптам зрабіўся сур'ёзным і сцішаным голасам сказаў:

— О, я вас разумею! Я і сам нядаўна пераехаў сюды з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі...

Падслухаў У.П.

ПАРОДЫІ

Георгій Юрчанка

Ганна Батый і Наталі Пятлюра

Ў прастору
майстра стол плыве —
і ценяў бег ад абажура
(збягае пацуковы век...)—
спяшае з Кіева Пятлюра...
Міхась Стрыгалёў.

Ярыла ў лютасці (пачуй!)
не шкадаваў яловых шышак.
Мне штосьць бружмеліла ўваччу,
калі прайшла Марына Мнішак.

Стрыбог праклыпаў па зямлі.
Квітучы парк гусцеў нанова.
Глядзела палка Наталі
(вы не забылі?) Ганчарова.

Ды мне была прыемней Керн,
яе запалі ў сэрца рысы.
За дальнім ясенем — павер!—
яшчэ дыміць Батыеў прысак.

Сыр-бор успыхнуў навакол,
вынегa пелася ў раскошы.
Пярун набыць імкнуўся стол
і ўжо адлічваў майстру грошы

(лімон — шыкоўная цана),
ды той зірнуў чамусь пахмура.
Расла на градках бузіна,
пад Мінскам швэндаўся
Пятлюра...

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 33-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Вінцук Вячорка, Віктар Гайсёнак, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Аляксей Глушко, Сяргей Запрудскі, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Зміцер Санько, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун, Віктар Шніп.
Адказны сакратар Здзіслаў Сіцька.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісаў рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Замова 2873

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, г.Менск, пр.Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 3970 паасобнікаў.
Падпісана ў друк 31.07.1995 г. у 15 гадзін